Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!
Камуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦК КП(б) БЕЛАРУСІ, СОЎНАРКОМА
І ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

60 (7386)
НЯДЗЕЛЯ
1
красавіка 1945 г.

Цана 20 кап.

ЗАГАД
Вярхоўнага Галоўнакамандуючага
Камандуючаму войскамі 1-га Украінскага фронта
Маршалу Совецкага Саюза КОНЕВУ
Начальніку штаба фронта
Генералу арміі САКАЛОУСКАМУ

Войскі 1-га УКРАІНСКАГА фронта сёння, 31 сакавіка, з боем авалодалі гарадамі РАТЫБОР і БІСКАУ—важнымі вузламі дарог і моцнымі апорнымі пунктамі абароны немцаў на левым беразе Одэра.

У баях за авалоданне гарадамі РАТЫБОР і БІСКАУ вызначыліся войскі генерал-палкоўніка КУРАЧКІНА, генерал-маёра ГАНЧАРОВА, генерал-маёра ТЕРТЫШНАГА, генерал-маёра ІЛЬНЫХ, генерал-маёра ОЗІМІНА, генерал-маёра ЗУБАВА, палкоўніка КАЗАРЫНАВА, палкоўніка ПЕТРЭНКА, генерал-маёра КРАСАВІНА, палкоўніка ЗАМАНАВА, генерал-маёра БАРЫСАВА, палкоўніка ГОЛЬЦАВА; танкісты генерал-палкоўніка ЛЕЛЮШЭНКА, генерал-маёра танкавых войск УПМАНА, генерал-лейтэнанта танкавых войск БЕЛОВА, генерал-маёра танкавых войск КУЗНЕЦОВА, палкоўніка КАРЭЦКАГА, падпалкоўніка ЗАЙЦАВА, падпалкоўніка ШЧЭРБАКА, падпалкоўніка ЧУРЫЛАВА, падпалкоўніка КАРНЮШКІНА, падпалкоўніка МАКАРАВА; артылерысты генерал-лейтэнанта артылерыі КАРАЛЬКОВА, генерал-маёра артылерыі КАБАТЧЫКАВА, генерал-маёра артылерыі МЕНЦЮКОВА, генерал-маёра артылерыі БІЦЮЦКАГА, генерал-маёра артылерыі ВОЛКЕНШТЭЙНА, палкоўніка ЛЮБІМАВА, палкоўніка ВОЛКАВА, палкоўніка КІВА, палкоўніка МІХАЙЛАВА, падпалкоўніка СКВАРНЮКА; лётчыкі генерал-палкоўніка авіяцыі КРАСОЎСКАГА, генерал-лейтэнанта авіяцыі РАЗАНАВА, генерал-маёра авіяцыі АРХАНГЕЛЬСКАГА, палкоўніка НІКІШЫНА, палкоўніка МАЧЫНА; сапёры генерал-маёра інжынерных войск КАНЦЭВОГА, палкоўніка ПОЛУЭКТАВА; сувязісты генерал-маёра войск сувязі НЕСЦЕРАВА, палкоўніка ОСТРЭНКА, маёра ГУСЛАЎСКАГА.

У азнаменаванне атрыманай перамогі злучэнні і часці, якія найбольш вызначыліся ў баях за авалоданне гарадамі РАТЫБОР і БІСКАУ, прадставіць да ўзнагароджання ордэнамі.

Сёння, 31 сакавіка, у 21 гадзіну сталіца нашай Радзімы МАСКВА ад імені Радзімы салютуе доблесным войскам 1-га Украінскага фронта, якія авалодалі названымі гарадамі,— дванаццаццю артылерыйскімі залпамі са ста дваццаці чатырох гармат.

За выдатныя баявыя дзеянні АБ'ЯЎЛЯЮ ПАДЗЯКУ кіруемым Вамі войскам, якія ўдзельнічалі ў баях за авалоданне гарадамі РАТЫБОР і БІСКАУ.

Вечная слава героям, паўшым у баях за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы!

Смерць нямецкім захопнікам!

31 сакавіка 1945 года.
№ 321.

Вярхоўны Галоўнакамандуючы
Маршал Совецкага Саюза І. СТАЛІН.

ЗАГАД
Вярхоўнага Галоўнакамандуючага
Камандуючаму войскамі 3-га Украінскага фронта
Маршалу Совецкага Саюза ТАЛБУХІНУ
Начальніку штаба фронта
Генерал-лейтэнанту ІВАНОВУ

Войскі 3-га УКРАІНСКАГА фронта, прадаўжаючы наступленне, сёння, 31 сакавіка, авалодалі гарадамі ВАШВАР, КЕРМЕНД, СЕНТГОТАРД—важнымі апорнымі пунктамі абароны немцаў на рацэ РАБА і на поўдні ад возера БАЛАТОН войскі балгарскай арміі з боем занялі горад ЧУРГО.

У баях за авалоданне гарадамі ВАШВАР, КЕРМЕНД, СЕНТГОТАРД і ЧУРГО вызначыліся войскі генерал-палкоўніка ТРАФІМЕНКА, генерал-лейтэнанта ГАГЕНА, балгарскай арміі генерал-лейтэнанта СТОЙЧЭВА, генерал-маёра ФОМІНА, генерал-маёра войск сувязі БРАГІНА, генерал-маёра ФІЛІПОЎСКАГА, генерал-маёра СЕМЁНАВА, генерал-маёра ТОШЭВА, палкоўніка ХАДЖЫ ІВАНОВА, генерал-маёра ФРАЛОВА, палкоўніка БАТЛУКА, палкоўніка СЕРГЕЕВА, палкоўніка ХАХЛОВА, палкоўніка ДРЭМЕНКОВА, палкоўніка ГАРАБЕЦ, палкоўніка ХАРЫЗАНАВА; артылерысты генерал-палкоўніка артылерыі НЕДЗЕЛІНА, генерал-маёра артылерыі ЛІВАНСКАГА, генерал-маёра артылерыі ЛЕБЕДЗЕВА, палкоўніка ПЕТРОВА, палкоўніка СІНІЦЫНА, палкоўніка МАЯНСКАГА, палкоўніка СЦЕФАНАВА, падпалкоўніка ШЫРАЕВА, падпалкоўніка ВЛАСЕНКА, падпалкоўніка ЛЕОНАВА, маёра КУЗМЕНКА; танкісты генерал-маёра танкавых войск ПАВЕЛКІНА, генерал-маёра ГАВАРУНЕНКА, палкоўніка ЛУК'ЯНАВА, палкоўніка ГАРЧЫНСКАГА, падпалкоўніка ШЭЎЧАНКА; лётчыкі генерал-палкоўніка авіяцыі СУДЗЕЦ, генерал-лейтэнанта авіяцыі ТОЛСЦІКАВА, генерал-маёра авіяцыі КАРСАКОВА, генерал-маёра авіяцыі БЕЛІЦКАГА, генерал-маёра авіяцыі ТІШЧАНКА, палкоўніка СМІРНОВА, палкоўніка ДЗЕМЕНЦЬЕВА, палкоўніка НЕДАСЕКІНА, палкоўніка УЛЬЯНАЎСКАГА, падпалкоўніка СЦЕПАНАВА, падпалкоўніка ІСАЕНКА, маёра ТЮШЭЎСКАГА; сапёры генерал-палкоўніка інжынерных войск КОТЛЯРА, генерал-маёра інжынерных войск КІЯШКА, палкоўніка ПАНІМАШ, палкоўніка ФАРАВА, палкоўніка ПАЎЛЕНКА; сувязісты генерал-лейтэнанта войск сувязі КАРАЛЁВА, генерал-маёра войск сувязі ТІТОВА, генерал-маёра авіяцыі МАРОЗАВА, палкоўніка АГАФОНАВА, палкоўніка ІЛЬЧЭВА, палкоўніка КАТКОВА.

У азнаменаванне атрыманай перамогі злучэнні і часці, якія найбольш вызначыліся ў баях за авалоданне ВАШВАР, КЕРМЕНД і другімі названымі гарадамі, прадставіць да ўзнагароджання ордэнамі.

Сёння, 31 сакавіка, у 22 гадзіны сталіца нашай Радзімы МАСКВА ад імені Радзімы салютуе доблесным войскам 3-га УКРАІНСКАГА фронта, у тым ліку балгарскай арміі генерал-лейтэнанта СТОЙЧЭВА, якія авалодалі названымі гарадамі,— дванаццаццю артылерыйскімі залпамі са ста дваццаці чатырох гармат.

За выдатныя баявыя дзеянні АБ'ЯЎЛЯЮ ПАДЗЯКУ кіруемым Вамі войскам, якія ўдзельнічалі ў баях за авалоданне найменаванымі гарадамі.

Вечная слава героям, паўшым у баях за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы!

Смерць нямецкім захопнікам!

31 сакавіка 1945 года.
№ 322.

Вярхоўны Галоўнакамандуючы
Маршал Совецкага Саюза І. СТАЛІН

ЗАГАД
Вярхоўнага Галоўнакамандуючага
Камандуючаму войскамі 2-га Украінскага фронта
Маршалу Совецкага Саюза МАЛІНОЎСКАМУ
Начальніку штаба фронта **генерал-палкоўніку ЗАХАРАВУ**

Войскі 2-га УКРАІНСКАГА фронта, прадаўжаючы наступленне, авалодалі горадам НІТРА і, фарсіраваўшы раку ВАГ, з боем занялі горад ГАЛАНТА — важны вузел дарог на шляхах да Братыславы.

У баях за авалоданне гарадамі НІТРА і ГАЛАНТА вызначыліся войскі генерал-лейтэнанта МАНАГАРАВА, генерал-маёра ЯКАЎЛЕВА, генерал-маёра ТЕРЭНЦЬЕВА, генерал-лейтэнанта САФІУЛІНА, генерал-маёра ЕСІНА, генерал-маёра АГАРОДАВА, генерал-маёра ЗДАНОВІЧА, генерал-маёра ПРЭАБРАЖЭНСКАГА, палкоўніка СОБАЛЕВА; кавалерысты генерал-лейтэнанта ПЛІЕВА; артылерысты генерал-маёра артылерыі ЗЫКАВА, генерал-маёра артылерыі ПАПОВІЧА, палкоўніка ПАСТУХА, палкоўніка ВЛАДЗІМІРАВА, палкоўніка НЕКРАСАВА, падпалкоўніка ЛЕОНЦЬЕВА, падпалкоўніка КІСЛОГА, падпалкоўніка ДЗЕНІСЕНКАВА, маёра ЛЯМЗІНСКАГА; танкісты палкоўніка СУПЯНА, палкоўніка ЗЕТРАНУ, падпалкоўніка АНТОНАВА; лётчыкі генерал-лейтэнанта авіяцыі ПАДГОРНАГА, генерал-маёра авіяцыі КАМАНІНА, палкоўніка САПРЫКІНА, палкоўніка КЛАБУКОВА, падпалкоўніка ЕРЭМЕНКА; сапёры генерал-маёра інжынерных войск ТУПІЧЭВА, генерал-маёра інжынерных войск ТЮЛЕВА, палкоўніка ІСАЕВА; сувязісты палкоўніка МАКАРЭНКА, палкоўніка ДАВЫДАВА, маёра НЕСЦЕРАВА, маёра ВАЛЧУКОВА.

У азнаменаванне атрыманай перамогі злучэнні і часці, якія найбольш вызначыліся ў баях за авалоданне гарадамі НІТРА і ГАЛАНТА, прадставіць да ўзнагароджання ордэнамі.

Сёння, 31 сакавіка, у 24 гадзіны сталіца нашай Радзімы МАСКВА ад імені Радзімы салютуе доблесным войскам 2-га УКРАІНСКАГА фронта, якія авалодалі названымі гарадамі,— дванаццаццю артылерыйскімі залпамі са ста дваццаці чатырох гармат.

За выдатныя баявыя дзеянні АБ'ЯЎЛЯЮ ПАДЗЯКУ кіруемым Вамі войскам, якія ўдзельнічалі ў баях за вызваленне НІТРА і ГАЛАНТА.

Вечная слава героям, паўшым у баях за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы!

Смерць нямецкім захопнікам!

31 сакавіка 1945 года.
№ 323.

Вярхоўны Галоўнакамандуючы
Маршал Совецкага Саюза І. СТАЛІН.

УКАЗ
Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР
аб назначэнні тав. Лахтанава Г. С. Намеснікам Старшыні Совета Народных Камісараў БССР

Назначыць тав. Лахтанава Грыгорыя Савельевіча намеснікам Старшыні Совета Народных Камісараў БССР.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР
Н. НАТАЛЕВІЧ.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР
Л. ПАПКОЎ.

31 сакавіка 1945 г.
г. Мінск.

УКАЗ
Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР
аб назначэнні тав. Пыж С. К. Народным Камісарам лясной прамысловасці БССР

Назначыць тав. Пыж Сцяпана Канстанцінавіча народным камісарам лясной прамысловасці БССР.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР
Н. НАТАЛЕВІЧ.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР
Л. ПАПКОЎ.

31 сакавіка 1945 г.
г. Мінск.

Ад Совецкага Інформбюро

АПЕРАТЫЎНАЯ ЗВОДКА ЗА 31 САКАВІКА

На 1-м БЕЛАРУСКІМ фронце на захадзе і паўднёвым захадзе ад горада КІСТРЫНЬ (КЮСТРЫН) нашы войскі акружылі і знішчылі значны гарнізон немцаў, які абараняў раён паміж ВАРТАЙ і ОДЭРАМ, пры гэтым узялі ў палон 3.170 нямецкіх салдат і афіцэраў і захапілі палявых гармат—54, кулямётаў—150. Праціўнік пакінуў на полі бою да 3.000 трупаў сваіх салдат і афіцэраў.

У раёнах ГЛОГАУ і БРЭСЛАУ нашы войскі прадаўжалі баі па знішчэнню акружаных груп нямецкіх войск.

Войскі 1-га УКРАІНСКАГА фронта 31 сакавіка з боем авалодалі гарадамі РАТЫБОР і БІСКАУ—важнымі вузламі дарог і моцнымі апорнымі пунктамі абароны немцаў на левым беразе ОДЭРА, а таксама з баямі занялі больш 50 другіх населеных пунктаў і сярод іх БРАТШ, ЦЮРМІТЦ, ХОХКРЭТШАМ, КАТШЭР, ТРЭМ, ЗАУДЫЦ, ВЕЙЕНДОРФ, ХОЕНЫРКЕН, ПШУЎ, РЫДУЛЬТАУ.

Войскі 2-га УКРАІНСКАГА фронта, прадаўжаючы наступленне, авалодалі горадам НІТРА і, фарсіраваўшы раку ВАГ, з боем занялі горад ГАЛАНТА—важны вузел дарог на шляхах да БРАТЫСЛАВЫ. У ходзе баёў за 31 сакавіка войскі фронта занялі больш 80 другіх населеных пунктаў, у тым ліку буйныя населеныя пункты КЕПЕШД, ШАЛЬЯ, ДЗЯКОЎЦЭ, ПЕРЭД, ЖЫГАРД, ГОРНІ САЛІБІ, МОСТОВА КЕРЦЬ, ГУТА, ЗЕМЯНСКА-ОЛЧА, ТАНІ і чыгуначныя станцыі ШАЛЬЯ, ПЕРЭД, ЖЫГАРД, НЕДЗЕД. Адначасова войскі фронта, наступаючы па паўднёваму берагу ДУНАЯ, занялі населеныя пункты ДУНАСЕГ, КУНСІГЕТ, МОШАНСЕНТМІКЛОШ, БЕШАРКАНІ, МАГЛОЦА. У баях за 30 сакавіка войскі фронта ўзялі ў палон больш 800 салдат і афіцэраў праціўніка.

Войскі 3-га УКРАІНСКАГА фронта, прадаўжаючы наступленне, 31 сакавіка авалодалі гарадамі ВАШВАР, КЕРМЕНД, СЕНТГОТАРД—важнымі апорнымі пунктамі абароны немцаў на рацэ РАБА і на поўдні ад возера БАЛАТОН войскі балгарскай арміі з боем занялі горад ЧУРГО. У ходзе наступальных баёў за 31 сакавіка войскі фронта занялі на тэрыторыі Венгрыі больш 100 другіх населеных пунктаў і сярод іх ШУТЭР, ХІДЭГШЭГ, КОПХАЗА (5 кілометраў на паўднёвым усходзе ад Шопрона), НАДЭЬЦЭНК, УНД, НАРАЙ, КАНДОРФА, ЕРЫСЕНТПЕТЭР, ЗАЛАБАЙША, НОВА, ШАРМЕЛЕК. Адначасова на тэрыторыі Аўстрыі, на паўднёвым усходзе ад ВІНЕР КОЙШТАДТ, войскі фронта занялі больш 70 населеных пунктаў і сярод іх ДОЙЧ КРОНЦ, НЕКЕНМАРКТ, ЛАКЕНБАХ, РЫЦЫНГ, ЧУРНДОРФ, ВІСМА, КІРХШЛАГ, РЭХНІТЦ. У баях за 30 сакавіка войскі фронта ўзялі ў палон больш 8.000 салдат і афіцэраў праціўніка. У ліку палонных камандзір 3 венгерскага армейскага корпуса генерал-лейтэнант Актолейко-Бейла.

На другіх участках фронта—пошукі разведчыкаў і ў радзе пунктаў баі мясцовага значэння.

За 30 сакавіка на ўсіх франтах падбіта і знішчана 50 нямецкіх танкаў. У паветраных баях і агнём зенітнай артылерыі збіта 25 самалётаў праціўніка.

* * *

Войскі 1-га Украінскага фронта з баямі прасоўваліся ўперад. Совецкія пехацінцы і танкісты прарвалі нямецкую абарону на паўночным захадзе ад горада Ратыбор. Праціўнік спешна перакінуў на гэты ўчастак значныя сілы пяхоты і танкаў і аказваў упорнае супраціўленне. Палонныя паведамляюць, што нямецкае камандаванне аддала загад любой цаной утрымаць Ратыбор — моцны апорны пункт, які прыкрывае шляхі да Мараўскай Остравы. Немцы, якія чакалі ўдару нашых войск з усхода і поўдня, умацавалі ўсходнія і паўднёвыя подступы да горада. Тут была пабудавана суцэльная паласа доўгачасовых умацаванняў — жалеза-бетонныя доты з падземнымі хадамі зносін, процітанкавыя рвы і дротавыя загароды. Зрабіўшы паспяховы абходны манеўр, нашы войскі ўварваліся ў Ратыбор з захада. Праціўнік, імкнучыся аднавіць становішча, прадпрыняў рад жорсткіх контратак. Адкідаючы гітлераўцаў, совецкія пехацінцы паступова абыходзілі горад. Адначасова другія нашы часці узмацнілі націск з усхода. Сёння днём, пасля ўпорных баёў, войскі фронта, зламаўшы варожае супраціўленне, авалодалі горадам Ратыбор—важным вузлом чыгунак і шасейных дарог. Ратыбор—буйны прамысловы цэнтр на рацэ Одэр. У ім ёсць машынабудаўнічыя, вагонабудаўнічыя і ваенныя заводы, суднабудаўнічая верф і іншыя прадпрыемствы. Пашымі войскамі занят таксама горад Біскау. За два дні баёў знішчана больш 3.000 гітлераўцаў, спалена і падбіта 37 танкаў і 14 бронетранспарцёраў праціўніка. Узята ў палон больш 1.000 нямецкіх салдат і афіцэраў.

* * *

Войскі 2-га Украінскага фронта прадаўжалі наступленне. Нашы часці з баямі выйшлі да горада Нітра, які размешчан у злучыне ракі Нітра, на яе заходнім беразе. Немцы часта пераходзілі ў контратакі. Нашы войскі адбілі варожыя контратакі і адкінулі праціўніка на заходні бераг ракі. Затым совецкія пехацінцы пераправіліся праз раку на поўдні ад горада і, зрабіўшы імклівы абходны манеўр, адрэзалі варожаму гарнізону ўсе шляхі адыходу. Горад Нітра быў падрыхтаван немцамі да доўгай кругавой абароны. Нашы войскі пры падтрымцы артылерыі ўварваліся ў горад з паўднёвага захада і ў выніку жорсткіх вулічных баёў авалодалі ім. Буйны нямецкі гарнізон у большай сваёй частцы знішчан. Частка гітлераўцаў склала зброю і здалася ў палон.

Войскі фронта, фарсіраваўшы раку Ваг, сёння занялі важны вузел дарог—горад Галанта, які знаходзіцца ў 45 кілометрах ад Братыславы. Праціўнік, адступаючы пад ударамі совецкіх войск, кідае многа ўзбраення і ваенных матэрыялаў.

* * *

Войскі 3-га Украінскага фронта прадаўжалі паспяховае наступленне. Усе спробы праціўніка затрымацца на прамежных рубяжах сарваны імклівымі дзеяннямі совецкіх часцей. Нашы танкісты і пехацінцы, якія ўступілі ў гарыстую, пакрытую лесам мясцовасць, абыходзяць варожыя вузлы абароны і неадступна праследуюць патропаныя нямецкія дывізіі. Жорсткія баі адбыліся ў даліне ракі Раба. Зламаўшы супраціўленне немцаў, совецкія часці авалодалі горадам Керменд і імкліва рушылі на захад. За дзень баёў нашы войскі прасунуліся на 30 кілометраў і выйшлі да горада Сентготард, які размешчан ля аўстра-венгерскай граніцы. Немцы, якія мелі выгадныя пазіцыі, мелі намер затрымаць тут совецкія часці, але былі разгромлены. Заняўшы горад Сентготард, нашы войскі захапілі многа палонных і вялікія трафеі. Паводле няпоўных даных, знішчана да 4.000 нямецкіх салдат і афіцэраў. Захоплена 32 танкі і самаходных гармат, 30 бронетранспарцёраў, 48 палявых гармат, 144 кулямёты, больш 300 аўтамашын, 30 паравозаў, 322 вагоны, 3 чыгуначныя эшалоны з інжынернай маёмасцю і 11 розных складаў.

* * *

29 сакавіка авіяцыяй Чырвонасцяжнага Балтыйскага флота ў Данцыгскай бухце патоплены: мінаносец, транспарт водазмяшчэннем у 5.000 тон і быстраходная дэсантная баржа праціўніка.

Выступленне Прэзідэнта Чэхаславацкай Рэспублікі п. Бенеша

Перад ад'ездам з Масквы Прэзідэнт Чэхаславацкай Рэспублікі д-р Э. Бенеш зрабіў на вакзале перад мікрафонам наступную заяву:

«Калі ў снежні 1943 года я наведаў Маскву, я развітаўся з Вамі, выказваючы надзею, што я тут сярод вас не ў апошні раз. Я гэта сказаў з упэўненасцю, што для нашай будучай палітыкі, для будучыні Чэхаславакіі гэты шлях, пракладзены нашым дагаворам, адзіна правільны шлях, па якому павінны ісці ўсе славянскія народы, што гэты шлях з'яўляецца залогам нашага вызвалення, залогам бяспекі нашых народаў і ў будучым.

І на гэты раз мой шлях у Маскву сімвалічны таму, што ён з'яўляецца апошняй астаноўкай па дарозе на радзіму, якую вызваляе ад германскага ворага доблесная Чырвоная Армія.

Дзякую вам усім за ўсю вашу дапамогу, якую вы нам аказалі і выказваю ўпэўненасць, што і ў будучым мы пойдзем разам з вамі, з нашым братам, насустрач шчаслівай будучыні вашага і нашага народаў».

КАВАЛЕРЫ ОРДЭНА „ПОБЕДА"

Маршал Совецкага Саюза
І. С. КОНЕЎ

Маршал Совецкага Саюза
Г. К. ЖУКАЎ.

Маршал Совецкага Саюза
К. К. РАКАСОЎСКІ.

ПА-БАЯВОМУ ПРАВЯДЗЕМ ВЕСНАВУЮ СЯЎБУ

ВЫЙДЗЕМ НА ПАЛЯВЫЯ РАБОТЫ ДРУЖНА І АРГАНІЗАВАНА!

* * *

ВЕСТКІ З ПАЛЁЎ

У ПАЛЕССІ ПАЧАЛІСЯ ПАЛЯВЫЯ РАБОТЫ

МАЗЫР. (Кар. «Звязды»). На Палессі ўстанавілася цёплае надвор'е, У калгасах, соўгасах і МТС завяршаюць апошнія падрыхтаванні да сяўбы, пачынаюць выбарачныя палявыя работы.

Аднымі з першых у абласці выйшлі ў поле калгаснікі арцелі імені Сталіна, Васілевіцкага раёна. Яшчэ 25 сакавіка тут былі ўзараны першыя два гектары пад яравыя культуры. Аратыя Міхаіл Сахор і Наум Майсеенка перавыконваюць дзённую норму ворыва.

Выйшлі на палявыя работы і калгаснікі сельгасарцелі імені Калініна , Мазырскага раёна. Комсамольцы Леанід Шумаж і Рыгор Дубіна, спаборнічаючы паміж сабой, за першы дзень узаралі па 0,75 гектара і выканалі па паўтары нормы.

Пачынаюць палявыя работы і ў калгасах Ельскага раёна. Першымі ўзяліся за ворыва ў выбарачным парадку калгасы «Новая Дуброва», «Большэвік» і «Перамога».

А. ЛЯСНЫ.

ПАЛЯВЫЯ РАБОТЫ НА ПІНШЧЫНЕ

ПІНСК. (Па тэлефону ад нашага спец. кар.). На Піншчыне стаіць цёплае надвор'е. З палёў сышоў снег. Хутка сохне зямля. Калгаснікі і сяляне-аднаасобнікі рыхтуюцца пачаць масавыя веснавыя работы.

Першымі на поле выйшлі члены двух сельскагаспадарчых арцелей Целеханскага раёна. Калгас «Серп і молат» пасеяў ужо 1,20 гектара аўса. У калгасе імені Сталіна ідзе падрыхтоўка глебы.

Да сяўбы прыступілі сяляне Столінскага, Ладзішчынскага, Жабіцкага раёнаў. Селянін вёскі Глінка, Столінскага раёна, Іван Арцемовіч пасеяў 0,2 гектара аўса, а Васіль Дучык—0,1 гектара.

З кожным днём палявыя работы пачынаюць усё новыя і новыя вёскі.

М. ВІШНЕЎСКІ.

ПАЧАЛІ ВОРЫВА

ДЗЕРЖЫНСК. (Па тэлефону). 30 сакавіка першым у раёне выбарачным парадкам пачаў палявыя работы калгас імені Калініна, Бараўскога сельсовета. У гэты дзень калгаснікі ўзаралі 2,8 гектара глебы. Якасць ворыва добрая.

Па меры прасыхання глебы пачынаюцца палявыя работы і ў другіх калгасах.

М. І. ГАРЛЕНКА,
загадчык Дзержынскага райза.

УЗАРАЛІ 70 ГЕКТАРАЎ

БАРЫСАЎ. (Па тэлефону ад кар. «Звязды»). На палях раёна пачаліся выбарачныя палявыя работы. Першымі выехалі ў поле калгасы Глівеньскага сельсовета. На палях сельгасарцелей «Шлях Леніна» і «Чырвоны дуб» учора працавала 18 пар коней. Пачалі ворыва калгасы імені Сталіна і «Першае Мая». За першыя дні ўзарана 50 гектараў глебы.

Калгасы «Другая пяцігодка» і «14-годдзе Кастрычніка», Касцюкоўскага сельсовета, узаралі 20 гектараў. Пачалі ворыва калгасы Вяліка-Стаханаўскага сельсовета.

Гэтымі днямі пачынаюць веснавыя работы ў Чэрнявіцкім і іншых сельсоветах раёна.

ВЫЙШЛІ НА КАЛГАСНЫЯ СЯДЗІБЫ

НАРОЎЛЯ. (Кар. «Звязды»). Гэтымі днямі ў Нараўлянскай МТС адбылася нарада трактарыстаў, брыгадзіраў і механікаў. На нарадзе падрабязна абмеркавана пастанова СНК БССР і ЦК КП(б)Б аб узмацненні сацыялістычнага спаборніцтва сярод рабочых і служачых МТС і МТМ.

Абмеркаваўшы пастанову, трактарысты Кірыл Рабчанка і Васілій Кулагенка абавязаліся выпрацаваць за сезон па паўтары тысячы гектараў на кожны трактар. Трактарысты Дзмітрый Лешчанка, Валенцін Матушка і Сяргей Голуб абавязаліся ўзараць за сезон па тысячы гектараў.

На другі дзень пасля нарады трактарысты пачалі вывозіць свае машыны на калгасныя сядзібы. 7 трактараў ужо выехалі ў калгасы раёна. Трактарысты і старшыні калгасаў падбіраюць падсохшыя ўчасткі поля для першага ворыва трактарамі.

ПЕРШЫЯ ГЕКТАРЫ

ІВАНАВА, 31 сакавіка. (БЕЛТА). У раёне пачалася веснавая сяўба. Першымі ў поле выехалі сяляне Магільноўскага сельсовета. 29 сакавіка яны ўзаралі і засеялі 13 гектараў. Сяляне сельсовета працуюць на палях ад раніцы да позняга вечара, дружна праводзяць усе пасеўныя работы.

Сяляне Андрэй Гаракевіч, Емельян Сацурта з вёскі Крыцешана за два дні закончылі сяўбу аўса.

ПРАВЕРКА БАЯВОЙ ГАТОЎНАСЦІ КАЛГАСАЎ ДА СЯЎБЫ

БАБРУЙСК, 27 сакавіка. (БЕЛТА). У калгасах абласці праходзяць масавыя агляды гатоўнасці калгасаў да веснавой сяўбы. Вынікі праверкі абмяркоўваюцца на калгасных сходах.

Паспяхова праходзіць агляд у калгасах Слуцкага раёна. У гэтым раёне за апошнія дні пробныя выезды праведзены ў 28 калгасах. Усе яны прадэманстравалі поўную гатоўнасць да сяўбы.

Сельгасарцелі Слуцкага раёна ў гэтым годзе давядуць пасеўную плошчу да памеру даваеннай.

БАЯВЫ ЭКЗАМЕН

* * *

1. ТРАКТАРЫ ПАЙШЛІ НА ЎЧАСТКІ

Цёплы вясновы дзень. Адзін за адным выходзяць на сядзібу МТС трактары і становяцца ў рад.

Атрымаўшы маршруты і неабходныя парады, трактарысты яшчэ раз праверылі маторы. Яны працавалі бездакорна.

Васілій Грыхуцік, стары вопытны трактарыст Пухавіцкай машынна-трактарнай станцыі сеў за руль свайго трактара і, махнуўшы рукой на развітанне з таварышамі, уключыў хуткасць.

— Не забывай пра абавязацельства,— напомніў яму брыгадзір трактарнай брыгады Владзімір Пракопавіч Верамейчык.

— За лета будзе 1.100 гектараў,—данесліся праз гул матора словы Грыхуціка.

Набіраючы хуткасць, трактар Васілія Грыхуціка пайшоў у напрамку калгаса «Чырвоны май», Турыпскага сельсовета.

— У надзейных руках машына,—з задавальненнем сказаў сакратар партыйнай арганізацыі МТС таварыш Навасад.

За ім пайшлі на вытворчыя ўчасткі ў Слабодскі і Гарэлецкі сельсоветы трактары брыгадзіраў Міхаіла Езубчыка і Паўла Матусевіча. Разам з імі ўпершыню едуць на палі і маладыя трактарысты. Яны будуць працаваць і вучыцца майстэрству працы на трактары.

Калгаснікі падрыхтаваліся да сустрэчы трактарыстаў. Не падвядуць іх і трактарысты. Яшчэ трэцяга сакавіка, дэталёва абмеркаваўшы зварот калектыва Прапойскай МТС, яны ўключыліся ў сацыялістычнае спаборніцтва на дастойную сустрэчу веснавой сяўбы і ўзялі канкрэтныя абавязацельствы. Яшчэ тады брыгада Аляксея Жаўнерчыка абавязалася на кожным 15-сільным трактары ўзараць 1.500 гектараў, зэканоміць 15 процантаў гаручага і 10 процантаў змазачных матэрыялаў.

2. АПОШНІЯ ПАДРЫХТАВАННІ.

На двары соўгаса «Індустрыя» незвычайнае ажыўленне. Стукаюць сякеры, звіняць пілы, з хлявоў ідуць падводы з гноем. Больш 16 работніц і падлеткаў нарыхтоўваюць чуркі, завастраюць колікі для памідораў, насенных буракоў і іншых культур.

Падышла падвода з лесаматэрыялам для чурак. Чорны, тлусты конь не хоча стаяць на месцы. Возчык ледзь стрымлівае яго.

— У нас усе такія коні,—гаворыць дырэктар соўгаса, былы партызан, ордэнаносец Фёдар Цімафеевіч Сіялка. —І збруя для іх у парадку. Ёсць нават два камплекты ў запас. Цяпер мы яшчэ лепш падкармліваем сваіх коней. Даем ім па 6 кілограмаў канцэнтратаў, не шкадуем канюшыны і сена.

У майстэрні былы партызан Віктар Лазарчык яшчэ раз правяраў толькі-што капітальна адрамантаваны трактар. Заўтра ён будзе здаваць яго дзяржаўнай прыёмачнай камісіі.

— Цяпер будзе ў нас два трактары,— гаворыць дырэктар. —А было ў нас да вайны сем. Нават адзін з іх ЧТЗ. Нямецкія зверы ўзарвалі іх. Толькі вунь кавалкі ляжаць.

Немцы спалілі ў соўгасе ўвесь сельскагаспадарчы інвентар. Са старога і гарэлага абсталявання і машын рабочыя выбралі некаторыя прыгодныя часткі і аднавілі два трактарныя плугі. Гэтыя плугі, пяць культыватараў, 58 боран і 26 конных плугоў хоць сёння гатовы да выхаду ў поле.

Ужо ў гэтым годзе ў соўгасе поўнасцю аднаўляецца севазварот і пасеўная плошча даводзіцца да даваеннай. Гэтай вясною яравых, тэхнічных культур і бульбы будзе пасеяна 470 гектараў. Насенне засыпана: яравога—655 цэнтнераў, бульбы — 1500 замест 1080 цэнтнераў, і канюшыны—36 цэнтнераў. Увесь насенны матэрыял кандыцыйны і мае 98—99 процантаў усхожасці.

Сёлета ў соўгасе мяркуецца атрымаць ураджай не ніжэй даваеннага. Бясспрэчна, што гэтага рабочыя соўгаса даб'юцца. Азімыя былі пасеены на добра ўтноенай і апрацаванай глебе. Пад веснавыя культуры вывезена ўжо 150 тон гною. Згуртаваны калектыў рабочых верне соўгасу яго былую славу перадавога ў рэспубліцы свінагадоўчага соўгаса.

Пачатак гэтаму зроблен. На свінаферме стаіць ужо 110 галоў свіней. Да канца 1945 года іх будзе каля 400. Знатная свінарка Ніна Васіна, зоатэхнік Ніна Баранава і вопытны дырэктар Фёдар Цімафеевіч Сіялка аддаюць справе ўсе намаганні і веды.

3. ЗАБЫЛІ ПРА АДСТАЮЧЫХ

На правым беразе ракі Пціч раскінуўся адзін з буйнейшых у раёне калгас «Культура». Яго землі патрабуюць угнаенняў і старанной апрацоўкі.

— Пціч выйшла з берагоў, значыць сеяць хутка будзем,—заўважае старшыня калгаса тав. Шашок.

Але чым будуць сеяць у калгасе «Культура»? Насенны фонд засыпан толькі жытам і ячменем. Яшчэ да гэтага часу абмен на культуры, неабходныя калгасу, не праведзен. Не закончана і паўторная ачыстка насення.

Нецярпіма становішча і з нарыхтоўкай мясцовых угнаенняў. Пра вывазку торфу на поле ў калгасе ніхто і не падумаў. За зіму сабрана толькі 300 кілограмаў попелу. У трэцяй брыгадзе (брыгадзір тав. Фурс) гэтага ўгнаення не зрабілі зусім. Нехапае патрэбнай колькасці калёс, плугоў і боран. Набыць новыя, хутчэй адрамантаваць старыя не паклапаціліся.

У калгасе ў брыгадах нібы арганізавалі звенні і назначылі звеннявых. Але гэта толькі на паперы. Рабочых планаў і для брыгад і для звенняў не склалі, сельгасінвентар і цягло не замацавалі. Веснавую сяўбу калгас сустракае без вытворчага плана.

Такое-ж становішча і ў калгасах «Авангард», «Чырвоны бор», Новасёлкаўскага сельсовета, у «Арэшкавічах», Талькаўскага сельсовета.

А сяўба надышла. Толькі райза і сельсоветы чамусьці здалёку глядзяць на непарадкі ў памянёных калгасах.

Міх. СІРОТКА.
(Кар. «Звязды»).

Пухавіцкі раён.

ВЯСНА Ў КАЛГАСЕ

Паволі ўзыходзіла сонца. Ад ракі ўжо цягнула ранішняй прахладай. Лёгкі вецер калыхаў набракшае вадой галлё старых ліп, хвой, бяроз. Даўно прачнуліся ў парку птушкі і па-вясеннему шчабяталі на розныя галасы. Прыгожа высвістваў сваю песню шпак. А з пачарнеўшага ўзгорку, што цягнецца за ракой, даносіліся прыемныя пералівы жаўранкаў.

Старшыня калгаса Васілій Аляксеевіч Івашын выйшаў на ганак былога панскага маёнтка. Тут цяпер размясцілася праўленне. Першыя праменні сонца, якія пасмамі прабіваліся праз ранішні туман, прыемна ласкалі твар. Васілій Аляксеевіч акінуў позіркам сядзібу калгаса, глыбока ўдыхнуў свежае паветра і пакрочыў у бок кузні.

— Добры дзень, Павел Кузьміч!

— Дзень добры,—адказаў стары каваль. — Вось заканчваю культыватары. К вечару можна будзе прыняць работу.

Пад паветкай, якую зімой прыстасавалі для інвентара, побач з кузняй, у парадку стаялі 19 адрамантаваных плугоў, 7 культыватараў. У адзін штабель былі складзены 15 адрамантаваных боран і іншы сельскагаспадарчы інвентар. Тут-жа, у кутку стаяла бляшаная банка з маслам. Лемяхі плугоў, зуб'і культыватараў і боран былі акуратна змазаны.

— Гэта па-гаспадарску,—пахваліў каваля Васілій Аляксеевіч, агледзеўшы адрамантаваны інвентар.

— А то як-жа інакш, — адказаў Павел Кузьміч.—Не першы год працую ў кузні. Ужо больш 40 год не выпускаю з рук молата. Практыку маю добрую. Шкада толькі, што большую частку свайго веку прышлося працаваць на паноў, не маючы ніякай карысці са сваёй працы. Цяпер іншая справа. Хоць і адчуваецца старасць, але-ж хочацца ўсё зрабіць як найлепш. Для сябе-ж працую зараз, для свайго калгаса. Лепш папрацуеш—больш і атрымаеш, больш будзе прыбыткаў і для нас і для радзімы.

Каваль лоўка прадзеў невялічкі боўцік, змацаваўшы новы лемяшок з пружынным зубам культыватара, хутка падабраў ключ, закруціў апошнюю гайку...

Энергічна працуюць у сельгасарцелі «Чырвоны бераг» усе калгаснікі. Конюх ці даярка, кладаўшчык ці брыгадзір паляводчай брыгады — усе старанна, клапатліва і настойліва рыхтуюцца да веснавой сяўбы. Ва ўсіх калгаснікаў зараз адно гарачае жаданне: залажыць гэтай вясной моцны фундамент заможнага, шчаслівага калгаснага жыцця.

Мы праходзім па калгасных свірнах. Кладаўшчык, маладая энергічная жанчына Анна Кайзер, прыклала нямала намаганняў і працы, каб да веснавой сяўбы падрыхтаваць высокаякаснае насенне. Авёс, ячмень, пшаніну, ільносемя, насенне канюшыны і іншыя культуры прыходзілася ачышчаць па два-тры разы, каб дабіцца поўнай чыстаты.

— Многа прышлося папрацаваць над ачысткай насеннага гароху, — гаворыць Анна Кайзер. —Колькі ні прапускалі яго праз трыер, але ўсё-ж знаходзіліся ў гароху іншыя зярняты. Прышлося перабіраць насенне ўручную. Хоць некалькі дзён і патрацілі на гэтую работу, але затое насенне цяпер — гарошына ў гарошыну.

Чыста вымецена падлога ў свірнах. У кутках кучкамі ляжыць насенне На кожнай кучцы дошчачка, на якой напісана назва насення, яго гатунак і колькасць кілограмаў. Тут-жа ў мяшках, якія падвешаны да столі, захоўваецца насенне капусты, буракоў, морквы, памідораў, бручкі і іншых агародных культур.

Яшчэ задоўга да праверкі насення на ўсхожасць у кантрольнай насеннай лабараторыі Анна Кайзер сама праверыла яго. Амаль усе культуры далі стопроцантную ўсхожасць.

Калгасны конюх Ілья Лук'янавіч Мядзвецкі рыхтуе да вясны добрую цяглавую сілу. У калгасе 18 коней. Усе яны вышэйсярэдняй укормленасці. Ілья Лук'янавіч яшчэ з восені падлічыў колькасць кармоў і ўвесь час выдаткоўваў іх па норме Ен ведае, што ў часе гарачай работы на палях коням будзе выдаткоўвацца ў суткі па пяць кілограмаў аўса, дастаткова канюшыны і сена.

Пад пасеў яравых гэтай вясной калгас вывез на свае палі больш 350 тон гною. За гэты час калгаснікі сабралі шмат попелу, птушынага памёту.

На веснавыя палявыя работы калгас заключыў з Рудаўскай МТС дагавор. Два трактары, якія хутка прыдуць у калгас, па плану павінны ўзараць 70 гектараў пахаці. Будуць працаваць дзве трактарныя радковыя сеялкі.

У калгасе ўлічана ўся рабочая сіла. Для паспяховай арганізацыі працы ў часе сяўбы тут створаны тры сталыя звяны: адно садова-агароднае і два палявodчыя. Кожнае звяно мае свой участак работы. Паміж звеннямі заключаны сацыялістычныя дагаворы.

... Калгас «Чырвоны бераг» арганізаваўся зімой у 1940 годзе. Да праклятай нямецкай акупацыі за нядоўгі час калгас разрасся ў багатую гаспадарку. Тады калгас еднаў 42 сям'і, валодаў 400 гектарамі пахаці, меў багатую эканамічную базу. Адных толькі кароў ён налічваў 90 галоў, апрача гэтага развівалася свінаферма, у якой было 18 свінаматак і 17 падсвінкаў. Была і аўцаферма — 39 авечак, пчолапасека — 23 вуллі. Калгаснікі прыклалі многа працы і намаганняў, каб дабіцца ў 1940 годзе ўраджаю з гектара 14—15 цэнтнераў. У тым-жа годзе калгаснікі ўпершыню атрымлівалі добра на працадні. Па 7 кілограмаў збожжавых, 12 кілограмаў бульбы, шмат гародніны, мёду прыпала тады на кожны працадзень.

Фашысцкія вылюдкі абарвалі ў 1941 годзе шчаслівае жыццё. Аграбілі, разбурылі багатую гаспадарку. Многа гора і пакут перанеслі за годы акупацыі жыхары маёнтка «Высокі бераг». І калі гераічная Чырвоная Армія выгнала праклятых варвараў з зямлі совецкай, тут адразу аднавілі калгас.

На адным з арганізацыйных сходаў восенню 1944 года калгаснікі аднадушна заявілі, што яны прыкладуць усе свае сілы і старанне, каб на працягу 1944—1945 гадоў зноў зрабіць калгас эканамічна моцным, давесці яго да даваеннага ўзроўню. Словы калгаснікаў не разыйшліся са справай. За невялікі час свайго існавання калгас стварыў ферму буйнай рагатай жывёлы, якая налічвае зараз 12 дойных кароў і 12 цялят. Для ўмацавання гэтай фермы ўсе калгаснікі закантрактавалі пялят ад прыплоду ўласных кароў. На ферму паступіла ўжо 8 закантрактаваных цялят.

Аднойчы на агульным сходзе старшыня паставіў пытанне аб арганізацыі фермы водаплаваючай птушкі. Ён далажыў сходу, што ў іх калгасе ёсць сэнс разводзіць качак і гусей.

— Рака блізка, — гаварыў тады на сходзе Васілій Аляксеевіч, — ды і догляд птушкі не патрабуе многа працы. А ферма вельмі выгадная і прыбытковая для нас і краіны нашай. Дык вось, давайце, абмяркуем, на якія сродкі мы набудзем гэтую ферму.

Тады ўсе калгаснікі заявілі, што кожны з іх выдзеліць з уласнага стада па дзве птушкі, а жанчыны абяцалі за вясну сабраць патрэбную колькасць яек для развядзення фермы.

Зараз у калгасе рыхтуецца спецыяльнае памяшканне для фермы водаплаваючай птушкі.

Днямі ў калгасе праходзіла праверка гатоўнасці да сяўбы. Пры гэтым прысутнічаў аграном-кансультант аблза І. М. Шчасцёнак. Камісія ўстанавіла поўную гатоўнасць калгаса да сяўбы.

Мала часу асталося да выезду ў поле. Калгаснікі чакаюць гэтага знамянальнага дня, як пешта ўрачыстае, дзень, які пакладзе аснову будучаму шчасцю.

Г. СТРАШКО.

Калгас «Чырвоны Бераг».
Несвіжскі раён. Баранавіцкая абласць.

Бліскучыя перамогі совецкай зброі

Гданьск ачышчан ад гітлераўцаў!

Гэтая вестка абляціць увесь свет. Старажытны польскі горад, які мае тысячагадовую гісторыю, важнейшы форпост Польшчы на берагах Балтыйскага мора, горад—хавальнік польскай культуры, зноў атрымаў свабоду. Над Гданьскам развяваецца дзяржаўны флаг Польскай Рэспублікі.

Закончылася адна з найбольш бліскучых аперацый Чырвонай Арміі, якія ўвасобілі прынцыпы наступальнай сталінскай стратэгіі. Вядома, што немцы сканцэнтроўвалі ва Усходняй Памераніі буйныя сілы для таго, каб ударыць у фланг нашым войскам, якія прасунуліся да Одэра. Разгадаўшы намер праціўніка, совецкае камандаванне нанесла немцам магутны ўдар. Войскі Маршалаў Жукава і Ракасоўскага пратаранілі стокілометравую глыбіню варожай абароны і выйшлі да берагоў Балтыкі. Групіроўка немцаў ва ўсходняй Памераніі была акружана.

Далейшыя падзеі развіваліся ў імклівым тэмпе. Совецкія войскі на працягу лічаных дзён ачысцілі ўсю велізарную тэрыторыю усходняй Памераніі. Рэшткі варожых дывізій былі прыціснуты да берагоў Данцыгскай бухты. Пачалася жорсткая бараньба за Гданьск і Гдыню.

Гданьск з'яўляўся важнейшым партом і першакласнай ваенна-марской базай немцаў на Балтыйскім моры. Важнай ваенна-марской базай праціўніка была і Гдыня. Асаблівае значэнне для немцаў яны набылі пасля таго, як Чырвоная Армія выбіла гітлераўцаў з тэрыторыі СССР і пазбавіла іх паўночных камунікацый. У апошні час Гданьск і Гдыня былі адзінымі дзеючымі партамі Германіі на Балтыйскім моры на ўсходзе ад Штэціна, які закрыт жэрламі совецкіх гармат. Тут базіраваліся ваенныя караблі, падводныя лодкі, гандлёвыя судны. Таму гітлераўская стаўка загадала сваім войскам абараняць гэтыя парты да апошняй магчымасці.

Вялікае было і эканамічнае значэнне Гданьска для германскай народнай гаспадаркі. У ім размешчаны буйнейшыя суднабудаўнічыя верфі, важныя ваенныя заводы, машынабудаўнічыя камбінаты, прадпрыемствы тэкстыльнай, хімічнай і харчовай індустрыі. Ён быў звязан чытункамі і паветранымі лініямі з галоўнымі гарадамі Польшчы і Германіі.

Гітлераўцы надалі выключную ўвагу абароне Гданьска і Гдыні. Шлях наступаючым перагараджалі шматлікія ўмацаванні доўгачасовага характару, гарады былі абнесены абарончымі абводамі. Патропаныя нямецкія дывізіі папоўніліся марскімі атрадамі і батальёнамі фольксштурма.

Усе намаганні праціўніка аказаліся дарэмнымі. Совецкія войскі расчлянілі прыціснутую да мора нямецкую групіроўку на дзве часткі. Часці Чырвонай Арміі і танкісты Першай Польскай Арміі ўварваліся ў Гдыню і Гданьск. Завязаліся гарачыя вулічныя баі. Вораг быў разбіт нагалаву. 28 сакавіка немцы былі вышыблены з Гдыні. Учора Загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Маршала Совецкага Саюза таварыша Сталіна абвясціў аб тым, што войскі Маршала Ракасоўскага авалодалі горадам і крэпасцю Гданьск. Данцыгская групіроўка праціўніка разгромлена. У баях за Гданьск нашы войскі ўзялі ў палон 10.000 нямецкіх салдат і афіцэраў, захапілі 45 падводных лодак, 140 танкаў і самаходных гармат і многа іншай ваеннай маёмасці.

Чырвоная Армія ачысціла ад гітлераўцаў усю тэрыторыю Польшчы. Чырвоная Армія вярнула польскаму народу Варшаву і старажытную сталіцу Польшчы—Кракаў. Зараз з рук Чырвонай Арміі польскі народ атрымаў свой старажытны горад і марскі порт — Гданьск. Ліквідавана гістарычная несправядлівасць, перастаў існаваць пра-славуты «польскі калідор», польскія землі зноў уз'еднаны ў адно.

Данцыгская аперацыя з'явілася новым сведчаннем выдатнага ваеннага майстэрства доблеснай Чырвонай Арміі. Совецкія войскі ў ходзе зімовага наступлення разграмілі германскую армію на поўначы, у цэнтры і на поўдні. Палкаводцы сталінскай школы нанеслі непапраўныя паражэнні ворагу. Воіны Чырвонай Арміі, загартаваныя ў агні бітваў, бязлітасна б'юць і знішчаюць ненавісных гітлераўцаў.

Сёння ў «Правде» друкуецца Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб узнагароджанні Маршалаў Совецкага Саюза таварышоў Конева, Жукава і Ракасоўскага ордэнам «Победа». З глыбокай радасцю ўспрыме гэтае паведамленне ўвесь совецкі народ.

На працягу ўсёй Айчыннай вайны з імёнамі гэтых палкаводцаў, выхаванцаў мудрай сталінскай школы перамогі, звязаны выдатныя аперацыі Чырвонай Арміі, у якіх ажыццяўляліся геніяльныя прадначартанні Вярхоўнага Галоўнакамандуючага. Яны ўмела кіравалі войскамі ў дні абароны Масквы, Ленінграда і Сталінграда, бязлітасна грамілі немцаў у лясах паўночнага захада, пад Орлом і Курскам, на палях Украіны і Беларусі, на тэрыторыі Польшчы, ва Усходняй Прусіі, Брандэнбургу, Памераніі, Сілезіі.

Вялікі рускі палкаводзец Пётр I гаварыў, што ўпраўленне войскамі ў баі «залежыць ад асцярожнасці, майстэрства і храбрасці генерала, якому становішча зямлі, сілу непрыяцеля і звычай яго ведаць і таму сваёй справай упраўляць належыць». Палкаводцы сталінскай школы валодаюць шырокімі ваеннымі ведамі і найбагацейшым вопытам бітваў гэтай бясспрыкладнай па маштабах і жорсткасці вайны. Сыны вялікага народа, яны выявілі таленты і дараванні буйнейшых майстроў совецкага ваеннага майстэрства. Умела выконваючы стратэгічныя замыслы і заданні Вярхоўнага Галоўнакамандавання Чырвонай Арміі, нашы палкаводцы кіруюць аперацыямі вялікага маштабу, у выніку якіх дасягнуты выдатныя поспехі ў справе разгрому нямецка-фашысцкіх войск.

На ўсіх участках велізарнага фронта Чырвоная Армія, якой упраўляюць ўмелыя палкаводцы, якой кіруе геніяльны стратэг таварыш Сталін, насмерць б'е ворага. Пазаўчора ў Маскве адгрымелі залпы ў чэсць войск Маршала Васілеўскага, якія разграмілі буйную групіроўку праціўніка на паўднёвым захадзе ад Кенігсберга. Усяго некалькі дзён назад сталіца Совецкага Саюза салютавала войскам Маршала Конева, якія разбілі немцаў на поўдні і захадзе ад Опельна.

Развеяўшы ў прах фашысцкія планы контрудару на поўдні, войскі Маршала Талбухіна змалолі нямецкую танкавую групіроўку на поўначы ад возера Балатон і перасеклі аўстрыйскую граніцу. Учора яны дабіліся новага поспеху: прарвалі абарону праціўніка на поўдні ад возера Балатон, прасунуліся ўперад да 30 кілометраў і занялі моцныя апорныя пункты варожай абароны, якія прыкрываюць нафтавы раён Надзьканіжа. Адначасова войскі фронта, прадаўжаючы сваё наступленне на захад, авалодалі гарадамі Залаэгерсег і Кестэль.

Паспяхова развіваюцца наступальныя аперацыі Маршала Малінoўскага па абодвух берагах Дуная. Учора стала вядома аб чарговай перамозе войск фронта. Фарсіраваўшы рэкі Гроп і Нітра, часці Чырвонай Арміі прасунуліся ўперад на 50 кілометраў і занялі моцныя апорныя пункты абароны немцаў на Браціслаўскім напрамку, у тым ліку буйны горад Комарно.

Пабедны гром совецкіх гармат зноў аднячасова раздаецца на ўсіх участках велізарнага фронта. Чырвоная Армія ў неаслабным тэмпе вядзе небачанае па размаху наступленне. Вялікія перамогі совецкіх войск паказваюць, што «Чырвоная Армія знаходзіць новыя і новыя сілы для вырашэння ўсё больш складаных і цяжкіх задач» (І. Сталін). Адзіны, глыбокі, геніяльны замысел адчуваецца ва ўсіх гэтых бліскучых аперацыях, якія разыгрываюцца на тэатры небывалага працяжэння.

Натхніцель і арганізатар гістарычных перамог вялікі Сталін вядзе Чырвоную Армію да канчатковай перамогі!

(Перадавы артыкул «Правды» за 31 сакавіка).

Ад Прэзідыума Акадэміі навук Беларускай ССР

Совет Народных Камісараў Беларускай ССР устанавіў Акадэміі навук Беларускай ССР дадатковую колькасць вакансій сапраўдных членаў і членаў-карэспандэнтаў.

У адпаведнасці з прынятай Советам Народных Камісараў Беларускай ССР пастановай аб адкрыцці ў Акадэміі навук БССР дадатковых вакансій сапраўдных членаў і членаў-карэспандэнтаў, Прэзідыум Акадэміі навук Беларускай ССР аб'яўляе аб выбарах сапраўдных членаў і членаў-карэспандэнтаў Акадэміі Навук Беларускай ССР па наступных спецыяльнасцях:

Гістарычныя навукі, беларуская літаратура, мова і мастацтва; хімія (лесахімія, торфахімія, біохімія, хімія калоідная, арганічная і фізічная); батаніка; зоалогія, біялогія; геалогія; эканоміка, метэралогія і кліматалогія; геадэзія; тэхналогія торфадабычы, механічная перапрапоўка торфу; лесаводства, сельскагаспадарчыя навукі (жывёлагадоўля, раслінаводства і агратэхніка, глебазнаўства, меліярацыя і балотазнаўства; механізацыя сельскай гаспадаркі); медыцынскія навукі; энергетыка; водны транспарт; архітэктура, будаўнічае мастацтва і механіка.

Навуковым і навукова-даследчым установам, грамадскім арганізацыям, а таксама паасобным вучоным і групам іх прадастаўляецца права на працягу двух месяцаў з дня гэтай публікацыі паведаміць Прэзідыуму Акадэміі навук Беларускай ССР імёны кандыдатаў у сапраўдныя члены і члены-карэспандэнты Акадэміі навук Беларускай ССР з ліку выдатных вучоных па паказаных вышэй спецыяльнасцях.

Матывіраванае прадстаўленне на вылучаемага кандыдата ў сапраўдныя члены або члены-карэспандэнты Акадэміі навук Беларускай ССР у пісьмовай форме з прыкладаннем адпаведных матэрыялаў (пастанова вучонага совета навуковай або навукова-даследчай установы, пастанова грамадскіх арганізацый, заява вучонага або групы вучоных, аўтабіяграфія і анкета кандыдата, спіс навуковых прац і водзывы аб іх, дакумент аб прысваенні вучонага звання і ступені, два фотаздымкі) трэба накіраваць на імя Прэзідыума Акадэміі навук Беларускай ССР па адрасу: горад Мінск, вуліца Пушкіна, 56, Акадэмія навук Беларускай ССР.

Прэзідыум Акадэміі навук Беларускай ССР.

ЗА РАБОТУ! Усе, як адзін,— на адбудову МІНСКА!

З НОВАИ СІЛАИ ЗА АДНАЎЛЕННЕ!

Мінула 9 месяцаў з часу вызвалення Мінска ад нямецкіх акупантаў.

За гэты час у Мінску адноўлена некаторая жыллёвая плошча, пушчаны і працуюць дзесяткі прамысловых прадпрыемстваў, працуюць культурна-бытавыя установы. Горад паступова апраўляецца ад цяжкіх ран, якія нанеслі яму нямецка-фашысцкія захопнікі.

Выконваючы рашэнне IX сесіі Мінскага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных Аб аднаўленні горада Мінска і працоўным удзеле насельніцтва ў аднаўленні горада», працоўныя правялі значную работу. За час ад IX да X сесіі адпрацавана больш 800 тысяч чалавека-гадзін. Працоўныя сабралі, ачысцілі і склалі ў штабялі звыш 6 мільёнаў штук цэглы, 570 тон металічных бэлек, 252 тоны водаправодных труб, 6.456 радыятараў, 36 тон арматурнага жалеза, 2.190 тон металалому.

Калектывы завода імені Мяснікова, мясакамбіната, радыёзавода і іншых паказалі ўзоры працы на аднаўленні горада. Калектыву рабочых і служачых мясакамбіната за добрую работу быў уручан пераходны Чырвоны Сцяг гарадскога Совета і гаркома КП(б)Б.

У сувязі з зімовымі халадамі работы па разборцы разбураных будынкаў і расчыстцы горада былі часова спынены. Паводле рашэння Мінскага гарадскога Совета і гаркома КП(б)Б з 1 красавіка зноў аднаўляецца масавы ўдзел працоўных у адбудове горада. Совецкім і партыйным арганізацыям, а таксама Мінскаму трэсту па разборцы разбураных памяшканняў і скарыстанню будматэрыялаў неабходна ўсю гэтую работу разгарнуць на аснове шырокага соцыялістычнага спаборніцтва. Асабліваю ўвагу неабходна аддаваць забяспечанню працоўных інструментам, распаўсюдзе графіка работ, дакладнаму ўліку адпрацаваных гадзін і аплаце працуючым. Неабходна разгарнуць вялікую масава-палітычную работу сярод калектываў прадпрыемстваў, устаноў і хатніх гаспадынь з тым, каб ні адзін мінчанін не астаўся пасля ўдзелам у аднаўленчых работах.

У мінулую восень кіраўнікі многіх прадпрыемстваў і ўстаноў не надалі сур'ёзнага значэння аднаўленчым работам, не мабілізавалі свае калектывы на высокапрадуктыўную працу. У выніку агульны план па разборцы разбураных дамоў, нарыхтоўцы цэглы і іншых будматэрыялаў не быў выканан нават на палавіну. У гэтым сезоне неабходна ўлічыць усе памылкі мінулага года, ліквідаваць усе недахопы, якія мелі месца ў нашай рабоце.

Адначасова з разборкай памяшканняў і нарыхтоўкай будматэрыялаў неабходна, згодна рашэння выканкома горсовета, шырока разгарнуць адбудову больш ста буйных і рад дробных каробак, замацаваных за арганізацыямі.

Праграма аднаўленчых і будаўнічых работ на 1945 год вялікая. Совецкі ўрад адпусціў на адбудову сталіцы Беларусі велізарныя грашовыя сродкі. З іх толькі па лініі горсовета—31,5 мільёна рублёў. На жыллёвае будаўніцтва запланіравана 15 мільёнаў рублёў. Аб'ём работ вельмі вялікі, але затое, справіўшыся з гэтай задачай, мы атрымаем дзесяткі тысяч квадратных метраў жыллёвай плошчы.

Вялікія сумы адпушчаны на комунальнае будаўніцтва і, у першую чаргу, на такія аб'екты, як водаправод, каналізацыя, трамвай, лазні, пральні, пабудова маста, які злучыць Чэрвеньскі тракт з Магілеўскім шасе і г. д. Гэтыя задачы можна паспяхова вырашыць толькі пры мабілізацыі ўсіх нашых сіл і магчымасцей, пры ўдзеле ўсяго працаздольнага насельніцтва ў аднаўленчых работах.

Неабходна памятаць і аб такім важным пытанні, як упарадкаванне горада і прывядзенне яго ў належны выгляд у санітарных адносінах. Горад наш запушчан і знаходзіцца ў дрэнным санітарным становішчы. X сесія горсовета аб'явіла месячнік па ачыстцы горада і прывядзенню яго ў санітарны выгляд. Трэсты, якія заклікаены шырока разгарнуць гэтую работу (сантрэст, трэст зялёнага будаўніцтва, трэст дарожнага будаўніцтва), вельмі павольна праводзяць у жыццё рашэнні сесіі. Усё насельніцтва горада, дырэктары прадпрыемстваў, устаноў павінны клапаціцца аб узорным парадку і добрым санітарным стане горада.

Неабходна, каб Упраўленне па аднаўленню горада Мінска ў бліжэйшыя дні пасапраўднаму перабудавала сваю работу. Кіраўнікі Упраўлення павінны аператыўна вырашаць усе пытанні, звязаныя з адбудовай выдзеленых аб'ектаў. Слаба яшчэ бяруцца за справу нашы забудоўшчыкі, марудзяць з афармленнем сродкаў, праектаў і забяспечаннем аднаўляемых аб'ектаў будаўнічымі матэрыяламі.

Наша задача—узняць усё насельніцтва сталіцы на актыўную дапамогу ў адбудове горада. Партыйныя, совецкія, комсамольскія і профсаюзныя арганізацыі, вулічныя камітэты павінны неадкладна разгарнуць вялікую палітычную работу сярод працоўных, мабілізаваць усе нашы сілы на агульнанародную будоўлю.

К. БУДАРЫН,
старшыня выканкома Мінскага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных.

Прадоўжым пачатую справу

Калі Чырвоная Армія набліжалася да Мінска, немцы прабавалі прымусіць нас будаваць розныя ўмацаванні, капаць акопы. Але мы хаваліся і не ішлі на гэтыя работы.

Нарэшце прышоў доўгачаканы дзень. Родны горад быў вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Скончыліся годы няволі і жаху, калі кожная гадзіна пагражала нам смерцю ад рук гэтых подлых забойцаў. У першы-ж дзень вызвалення я, у ліку многіх другіх хатніх гаспадынь, пайшла прыбіраць клінічны гарадок. З вялікай радасцю, клапатліва прыводзілі мы ў парадак кожны куток, каб у чыстаце і ўтульнасці прыняць нашых раненых воінаў—слаўных вызваліцеляў Мінска.

Праходзячы па разбураных вуліцах горада, я заўсёды ўспамінала, якімі прыгожымі і ажыўленымі былі яны да вайны. Хацелася сваёй працай дапамагчы хутчэй адбудаваць нашу беларускую сталіцу. Рашэнне сесіі Мінскага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных аб аднаўленні Мінска выказала жаданне ўсяго народа, усяго насельніцтва горада—прыкласці свае намаганні, каб зрабіць Мінск добраўпарадкаваным, квітнеючым.

Я з ахвотай узялася за работу і адпрацоўвала на будаўніцтве не менш 67 гадзін у месяц. Калі адчуваеш, што прыносіш карысць радзіме, што будуеш для шчасця свайго народа, для сябе, тады працуеш лёгка і радасна. Працавала я на аднаўленні маста праз раку Свіслач і на іншых аб'ектах. І радуецца маё сэрца цяпер, калі праходжу праз прыгожы, добра пабудаваны мост, бо тут закладзена і доля маёй працы.

Нядаўна я атрымала паведамленне, што мой муж забіт на фронце. Гэта для мяне вельмі цяжкая ўтрата, але я ведаю, што ён загінуў, абараняючы сваю Радзіму ад жрывавых забойцаў і грабежнікаў. Шануючы яго памяць, я буду яшчэ больш энергічна працаваць па аднаўленні Мінска таму, што мой муж любіў свой горад і не хацеў-бы бачыць яго ў руінах і папялішчах.

Я выхоўваю двух сірат—8-гадовую Інну і 13-гадовага Ігара, бацькі якіх забіты немцамі. Але я заўсёды знайду час, каб дакладна па графіку выйсці на работу на свой аб'ект.

Прышоў час прадоўжыць работу па аднаўленню роднага горада. Я заклікаю ўсіх хатніх гаспадынь Мінска прыняць актыўны ўдзел у будаўніцтве, працаваць самааддана і добра. Да гэтай справы трэба адносіцца па-гаспадарску. Якая-ж гаспадыня не прывядзе ў парадак свой дом, не будзе імкнуцца зрабіць яго прыгожым і ўтульным? Так будзем-жа лічыць, што разбураны ворагамі Мінск—гэта наш вялікі агульны дом. Навесці ў ім парадак—гэта наш начэсны абавязак.

Анна ЯКАВЕНКА,
хатняя гаспадыня.

Утрымаем пераходны чырвоны сцяг

У мінулым годзе калектыў мінскага мясакамбіната горача адгукнуўся на рашэнне сесіі Мінскага Горсовета дэпутатаў працоўных аб удзеле ўсяго насельніцтва ў адбудове свайго горада.

Закасаўшы рукавы, працавалі мы на разборцы разбураных дамоў, ачышчалі цэглу, падрыхтоўвалі пляцоўкі для новых пабудоў.

Партарганізацыя нашага прадпрыемства праводзіла сярод рабочых вялікую палітмасавую работу. Агітатары ў цэхах штодзённа праводзілі гутаркі аб удзеле рабочых у народнай будоўлі. На аднаўленчых работах комуністы паказвалі прыклады стаханаўскай працы.

Шчырае жаданне рабочых хутчэй адбудаваць і ўпарадкаваць сваю любімую сталіцу знайшло сваё выражэнне ў высокай прадукцыйнасці працы. Брыгады, якія ўзначальвалі тт. Савіцкая. Хімчэнкаў. Сталярова, штодзённа выконвалі нормы на 300—350 процантаў. Некаторыя рабочыя, як тт. Бацян, Малевіч, дабіліся выдатных вынікаў. Прымяняючы стаханаўскія метады работы, яны выконвалі свае заданні на 1.150—1.170 процантаў.

У выніку добра арганізаванай работы мы ў 1944 годзе адпрацавалі звыш плана 4.943 гадзіны. Адной толькі цэглы было намі выбрана, ачышчана і складзена ў штабялі больш 52 тысяч штук. Апрача гэтага мы знеслі 209 кубаметраў шчэбню, 31 тону жалезных бэлек і 109 кубаметраў іншых грузаў.

Гэтыя вынікі былі намі дасягнуты на аснове шырокага соцыялістычнага спаборніцтва не толькі ў межах нашага прадпрыемства, але і з другімі калектывамі. У гэтым спаборніцтве мы вышлі пераможцамі і атрымалі пераходны Чырвоны Сцяг Мінскага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных і гаркома КП(б)Б.

Сёння зноў пачынаюцца работы па аднаўленню Мінска. Наш калектыў падрыхтаваўся да гэтага дня. Брыгады аднаўленцаў гатовы да выхаду на аб'екты, забяспечаны інструментам. На сваім прадпрыемстве мы зрабілі дадаткова 20 насілак, 30 кірак, 25 лапат.

На агульным сходзе рабочых нашага камбіната абмеркаваны практычныя мерапрыемствы па лепшай арганізацыі працы на будаўніцтве. Калектыў узяў на сябе канкрэтныя абавязацельствы.

Ва ўсіх выступленнях рабочыя выказвалі гарачае жаданне ўзняць свой горад з руін і папялішчаў. Работніца тав. Жабуронак сказала:

— Наш абавязак арганізаваць працу так, каб людзі, прышоўшы на аб'ект, не трацілі ні адной хвіліны дарма і адразу браліся за работу. У гэтым годзе мы павінны зноў атрымаць перамогу і не выпусціць пераходны Чырвоны Сцяг са сваіх рук. Я бяру абавязацельства выконваць дзённыя нормы не менш, чым на 200 процантаў. Кожны месяц я буду адпрацоўваць на будаўніцтве звыш плана 5 гадзін. Справа аднаўлення роднай сталіцы павінна стаць справай чэсці кожнага рабочага нашага камбіната.

На сходзе было прынята аднадушнае рашэнне—забяспечыць высокую прадукцыйнасць і якасць аднаўленчых работ, дабіцца добрага захоўвання будаўнічых матэрыялаў і выканання штодзённых норм выпрацоўкі не менш, чым на 200 процантаў. Апрача гэтага кожны член нашага калектыва штомесячна адпрацуе на аднаўленні горада замест 30—35 гадзін.

Мы выклікалі на соцыялістычнае спаборніцтва калектыў скурзавода «Большэвік» і будзем змагацца за лепшую арганізацыю працы, за выдатныя паказчыкі.

Е. КАПЛАН,
сакратар партарганізацыі мінскага мясакамбіната.

З маладым задорам

Восенню 1944 года каля чорнага, абгарэлага будынка на Пушкінскай вуліцы часта можна было бачыць маладзёжныя брыгады, якія з кіркамі, насілкамі, лапатамі энергічна працавалі на будоўлі.

Дружная праца, маладыя задорныя галасы прыцягвалі ўвагу праходзячых. Гэта працавалі студэнты Мінскага педінстытута імені Максіма Горкага, якія ўзялі на сябе абавязацельства адбудаваць памяшканне свайго інстытута.

У мінулым годзе на сваім будаўнічым участку наш калектыў адпрацаваў больш 20 тысяч гадзін. Студэнткі Валынец, Шкіловіч, Жыліна, Кароткіна, Вайцэховіч кожны месяц адпрацоўвалі звыш нормы па 10 гадзін.

— Мы прыкладзем усе намаганні,—гаварылі яны, — каб убачыць Мінск яшчэ прыгажэйшым, чым ён быў да вайны. Мы адбудуем зруйнаваныя ворагам навучальныя ўстановы і будзем зноў вучыцца ў светлых, прасторных аудыторыях.

Цяпер студэнцтва нашага інстытута падрыхтавалася да прадаўжэння работ па аднаўленню роднай сталіцы. Створаны брыгады, падрыхтаван інструмент, вызначаны адказныя за кожны ўчастак работы.

У гэтым годзе мы будзем змагацца за тое, каб комсамольцы і моладзь нашага інстытута выйшлі ў першыя рады аднаўленцаў Мінска.

Л. САВІНАВА,
сакратар комсамольскага камітэта педінстытута імені М. Горкага.

Гатовы да выхаду на работу

За зімовы перыяд на радыёзаводзе імені Молатава 100 чалавек рабочых авалодала будаўнічымі спецыяльнасцямі, каб ва ўсеўзброенні сустрэць веснавы сезон па аднаўленню Мінска.

На прадпрыемстве ў апошнія дні прайшлі пэхавыя сходы, прысвечаныя ўзнаўленню аднаўленчых работ. На заводзе праведзена добрая падрыхтоўка да выхаду на работу. Кожны член калектыва ведае, колькі гадзін у месяц яму трэба адпрацаваць. Створана 13 брыгад і ў кожнай з іх вылучан брыгадзір. У ліку гэтых брыгад—дзве комсамольска-маладзёжныя. Адной з іх будзе кіраваць работніца Вікторыя Міхедко, а другой—комсорг завода Владзімір Лебедзеў.

Усе аднаўленчыя работы будуць праводзіцца на аснове шырокага соцыялістычнага спаборніцтва паміж брыгадамі.

—<>—

РАЗГОРТВАЕЦЦА СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА

На заводзе, дзе дырэктарам тав. Вульман, 28 сакавіка адбыўся агульназаводскі сход, прысвечаны пытанню ўдзелу ў аднаўленчых работах горада.

На сходзе выступілі тт. Лапуноў, Гудовіч, Зорын і многія другія. Яны выказалі гарачае жаданне ўсяго калектыва энергічна ўзяцца за работу. Тут-жа на сходзе рабочыя ўзялі на сябе канкрэтныя абавязацельствы. Паміж цэхамі і паасобнымі рабочымі заключаны соцыялістычныя дагаворы за хуткае і высокаякаснае вядзенне народнай будоўлі.

На гэтым прадпрыемстве таксама закончана і арганізацыйная падрыхтоўка: рабочыя арганізаваны ў брыгады, якія палкам забяспечаны інструментам, выдзелен спецыяльны чалавек, які адказвае за нарміраванне работ, выходзяць баявыя лісткі.

—<>—

КОМСАМОЛЬСКА-МАЛАДЗЁЖНЫЯ БРЫГАДЫ

Калектыў рабочых, інжынерна-тэхнічнага персанала і служачых мінскага піўзавода «Беларусь» добра падрыхтаваўся да адбудовы горада. Тут створана пяць брыгад, з іх тры комсамольска-маладзёжныя. Брыгадзірамі гэтых брыгад вылучаны стаханаўцы завода, якія ў зімовы час авалодалі будаўнічымі спецыяльнасцямі.

Кожны рабочы прадпрыемства забяспечан інструментам і ведае колькі гадзін у месяц яму трэба адпрацаваць.

Паміж цэхамі і брыгадамі заключаны соцыялістычныя дагаворы. Кожная брыгада будзе змагацца за лепшую арганізацыю працы, за перавыкананне дзённых норм.

—<>—

НА БУДОЎЛЮ!

У мінулым годзе калектыў работнікаў беларускага навукова-даследчага інстытута меліярацыі і балотнай гаспадаркі нядрэнна ўдзельнічаў у адбудове горада.

Зараз калектыў інстытута падрыхтоўваецца да прадаўжэння аднаўленчых работ. Гэтымі днямі адбыўся агульны сход, прысвечаны пытанню ўдзелу ў адбудове Мінска. На сходзе прысутнічала звыш 50 работнікаў. Кожны выступаючы ўзяў на сябе канкрэтныя абавязацельствы. Створаны тры брыгады, паміж якімі заключаны дагаворы на соцыялістычнае спаборніцтва.

Абавязацельствы брыгадзіраў-аднаўленцаў

30-га сакавіка адбыўся агульны сход брыгадзіраў-будаўнікоў, старшынь вулічных камітэтаў Кагановіцкага раёна па пытанню ўзнаўлення адбудоўчых работ і задачы брыгадзіраў. На сходзе прысутнічала 300 чалавек.

Выступаўшыя брыгадзіры і старшыні вулічных камітэтаў падзяліліся вопытам сваёй работы і ўскрылі недахопы ў рабоце мінулага года.

У сваім рашэнні ўдзельнікі схода запісалі:

— Мы выклікаем на соцыялістычнае спаборніцтва брыгадзіраў-будаўнікоў Варашылаўскага раёна на барацьбу за атрыманне пераходнага Чырвонага Сцяга і граматы Мінскага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных і гаркома КП(б)Б «Лепшаму ўдзельніку адбудовы горада». Бярэм на сябе наступныя абавязацельствы:

1. Своечасова падрыхтаваць рабочае месца і інструмент, не дапускаць прастояў у рабоце.

2. Арганізаваць стопроцантны выхад сваіх брыгад на работу, згодна вызначанага графіка.

3. Дабіцца поўнай адпрацоўкі ўстаноўленых гадзін кожным членам брыгады, выканання і перавыканання норм выпрацоўкі.

БУДУЧЫНЯ

У 195... годзе палкоўнік Васілій Савельевіч Новікаў, атрымаўшы водпуск, рашыў паехаць на радзіму—у Мінск. Тут ён нарадзіўся і рос, адсюль добраахвотна пайшоў на фронт.

Даўно адшумела вайна. Людзі, вярнуўшыся да мірнай працы, будавалі новыя гарады і вёскі, і палкоўнік нават не мог уявіць, якім ён убачыць родны горад. У часе вайны ён вызваляў Мінск ад нямецкіх акупантаў і бачыў, якія страшэнныя разбурэнні нанеслі немцы гораду. А пасля ён не раз чуў аб тым, з якім вялікім энтузіязмам узяўся беларускі народ адбудоўваць сваю сталіцу. Яго хвалявалі гэтыя паведамленні, ён імкнуўся зразумець сэнс кожнага газетнага радка, шукаў назвы знаёмых вуліц, і калі знаходзіў іх,—вельмі радаваўся.

...Поезд прышоў у Мінск у полудзень. Праменні майскага сонца залівалі яркім святлом вуліцы, залацістымі фарбамі рассыпаліся па цудоўных дамах горада. Пасажыраў сустрэла вясёлая, напаўняючая душу радасцю жыцця, музыка рэпрадуктараў. Палкоўнік успомніў, што да вайны Мінск такой-жа бадзёрай музыкай сустракаў пасажыраў, і прыемнае пачуццё ахапіла яго.

Хутка гэтае пачуццё яшчэ больш узмацнілася. Васілій Савельевіч выйшаў на прываказальную плошчу. Яшчэ да вайны ён ведаў, што гэтая плошча павінна была расшырацца, што вакол яе павінны былі забудоўвацца новыя вуліцы, але тое, што ён зараз убачыў, здзівіла яго, выходзіла з рамак яго ўяўлення. Велізарная, залітая асфальтам плошча, з цудоўным помнікам чыгуначніку, герою-партызану Айчыннай вайны, з шырокім зялёным бульварам, які вёў у цэнтр горада, раскінулася перад яго вачыма. Некалькі трамваяў адзін за другім праязджалі па плошчы, мякка пракаціўся тралейбус. Бесперапынна імчаліся аўтамашыны. Вакол плошчы ўздымаліся ззяючыя сваёй прыгожасцю будынкі з прывабнымі вітрынамі магазінаў, кіно, гасцініцы. Палкоўнік стаяў, нібы зачараваны. Перад ім паўставаў адноўлены, прыгожы і велічны горад. Ён рашыў не садзіцца ні на трамвай, ні на тралейбус, а пайсці пехатой, каб лепш агледзець горад. Прамым, як страла, бульварам вышаў ён на Совецкую вуліцу. Адразу ён нават не паверыў, што гэта была Совецкая вуліца, але хутка ён заўважыў манументальны будынак Дома Ўрада і яшчэ некалькі будынкаў, знаёмых яму ў даваенным былым Мінску.

Вуліца ў 30—35 метраў шырынёй, нібы люстра, ззяла на сонцы светлым асфальтам. Зніклі вузкія, брудныя завулкі, якія падыходзілі да яе, зніклі драўляныя домікі, рознастыльныя пабудовы і высокія, без густу пабудаваныя каробкі дамоў. Уся вуліца, усе дамы стварылі тут адзіны архітэктурны ансамбль, манументальныя пабудовы красаваліся белымі каланадамі, дарагой і самай дзівоснай архітэктурнай апрацоўкай. Сярод іх вызначаўся смеласцю думкі і фантазіі архітэктара цудоўны Палац мастацтваў. Палкоўнік з наіўнасцю дзіцяці распытваў мінчан аб усіх гэтых пабудовах, і гаражане з нескрываемым задавальненнем расказвалі прыезджаму аб сваім горадзе.

Хутка Васілій Савельевіч зноў выйшаў на плошчу і пасярод яе ўбачыў помнік. На высокім п'едэстале ён разгледзеў бронзавую фігуру Народнага паэта Беларусі Янкі Купалы. Насупроць помніка ўзвышаўся Драматычны тэатр імені вялікага паэта. Палкоўнік крыху пастаяў на плошчы і, ўспомніўшы, што тут раней вузкая Комсамольская вуліца перасякалася з Совецкай, радасны і ўсхваляваны велічным пераўтварэннем горада, лёгка пакрочыў далей.

Васілій Савельевіч да вайны жыў на Ленінскай, але былой Ленінскай вуліцы ён не знайшоў. Тут на два кварталы паміж вуліцамі Ленінскай і Энгельса ад былой плошчы Свабоды да гарадскога сквера шумела зеленню вялікая новая плошча, з фантанамі, вадаёмамі, помнікамі героям Айчыннай вайны. Па баках плошчы ўзвышаліся здзіўляючыя прыгожасцю шматпавярховыя дамы, атэлі. Ад плошчы Свабоды, нібы праменні сонца, разыходзіліся некалькі шырокіх асфальтаваных магістралей ва ўсе напрамкі горада.

Вуліцы і плошчы былі запоўнены людзьмі. Бадзёрыя, добра апранутыя ішлі яны ў кіно і тэатры, у паркі і скверы, заходзілі ў госці да знаёмых. Быў выходны дзень, і людзі ва ўсёй паўнаце скарыстоўвалі яго для культурнага і карыснага адпачынку.

У парку палкоўнік падсеў на лаве да старыка і, узрушаны ўсім, што бачыў, запытаўся:

— Скажыце, калі ласка, як можна было так хутка пабудаваць такі цудоўны горад?

— Што-ж, сынок —адказаў старык,— сіла, кажуць, і горы рушыць. Вось і тут вялікая сіла працавала. Кожны мінчанін працаваў, ды яшчэ як. Вось і ўзняўся горад. А вы адкуль зараз?—у сваю чаргу запытаў стары.

— З вакзала.

— У-у, дык вы і палавіны не бачылі, і не ведаеце таго, што зроблена ў Мінску,—ажывіўся стары.—Вось бачыце—там кварталы светлых і прыгожых дамоў,—паказваючы рукой, гаварыў стары,—тэта жылыя дамы. Вунь толькі ў адным тым доме некалькі сот кватэр. А якія кватэры! Там усё да тваіх паслуг. Або вось сядайце вы на трамвай, ды з'ездзіце на ўскраіны горада, паглядзіце, што там зроблена. Там-жа цудоўныя асабнякі людзі пабудавалі сабе. Совецкая ўлада дапамагла. Цяпер вы не знойдзеце мінчаніна, які-б жыў у падвале.

Стары ўсё больш натхняўся, і палкоўнік не спыняў яго. Ён слухаў здзіўляючую казку аб нараджэнні сонечнага горада і баяўся, каб не прапусціць піводнага слова з гэтай казкі. Стары-ж, узрушаны такой увагай прыезджага да яго расказа аб горадзе, які ён уласнымі рукамі перабудоўваў сумесна з другімі мінчанамі, апавядаў далей:

— А мінскага возера вы не бачылі? А парка каля яго? Го, я сам там калісьці садзіў дрэвы. А паглядзелі-б вы што там цяпер робіцца! Лес шуміць над возерам. Гэта зараз любімае месца адпачынку мінчан...

... Гэта не фантазія. Мы заглянулі наперад, у будучыню. Такім будзе Мінск. Горад палацаў, плошчаў, паркаў. Горад добрабыту працоўных узнімецца з руін і папялішчаў. Ужо цяпер мінчане сваёй самаадданай працай дзень за днём ствараюць гэты велічны горад будучыні. І чым лепш мы будзем працаваць на аднаўленні, тым хутчэй адродзіцца наша сталіца, тым хутчэй яна стане такой, якой убачыць яе палкоўнік Васілій Савельевіч Новікаў у 195... годзе.

Георгій ШЧАРБАТАЎ.

МІЖНАРОДНЫ АГЛЯД

Прайшоўшы тыдзень азнаменаваўся новымі выдатнымі падзеямі, якія паскараюць разгром гітлераўскай Германіі. Характэрная рыса гэтых падзей заключаецца ў тым, што нарастае магутнасць узгодненых удараў па праціўніку на ўсіх участках баявых дзеянняў, паскараюцца тэмпы прасоўвання совецкіх і саюзных войск да важнейшых жыццёвых цэнтраў Германіі.

Чырвоная Армія паспяхова завяршае знішчэнне вялікіх і малых «катлоў» ва Усходняй Прусіі і на ўзбярэжжы Балтыйскага мора. Захоп Гдыні і Данцыга—гарадоў і ваенных партоў, а таксама ліквідацыя акружанай усходне-прускай групіроўкі праціўніка на паўднёвым захадзе ад Кенігсберга—сведчанне новых магутных удараў нашых войск па ворагу. На поўдні, у раёне возера Балатон, Чырвоная Армія таксама разграміла буйную варожую групіроўку ў саставе 11 танкавых і некалькіх пяхотных дывізій, прасунулася ўперад і ўступіла на тэрыторыю Аўстрыі.

Адначасова нашы саюзнікі разгарнулі шырокія наступальныя аперацыі на заходнім фронце. Усё левабярэжжа Рэйна, якое лічылася немпамі непрыступным, ужо ачышчана ад гітлераўскіх войск. Створаны і расшыраюцца плацдармы на ўсходнім беразе гэтай ракі, якая аказалася цяпер у тылу саюзных войск. Войскі саюзнікаў уступілі ў Франкфурт-на-Майне. Рур—асноўная ваенна-прамысловая база Германіі,—ператварыўся ў арэну бітваў. Нямецкія ўлады ўжо выдалі надзвычайны дэкрэт, які абавязвае ўсіх немпаў прызыўнога ўзросту і моладзь звыш 14 год пакінуць Рурскую абласць. Шведскі друк паведамляе аб эвакуацыі нават Нюрнберга, які размешчан у Баварыі.

Гітлераўскім войскам не дапамагла замена аднаго камандуючага другім. Касельрынг, які прыйшоў на змену Рундштэдту, не выратуе становішча, бо ў яго распараджэнні цяпер ужо няма патрэбных рэзваў, а наяўныя, па вестках замежнага друку, 15 дывізій, не ў сілах затрымаць прасоўванне саюзнікаў.

* * *

Люгендорф, гэты натхнёнель «татальнай вайны», у сваіх успамінах аб мінулай сусветнай вайне гаварыў: «Наша паражэнне было-б немінуча, калі-б непрыяцель захапіў па доўгі час германскую тэрыторыю». Факты паказваюць, што і зараз ваенная катастрофа немпаў на франтах азначае для гітлераўскай Германіі эканамічную катастрофу ўнутры краіны, азначае немінучасць хуткага крушэння ўсёй «трэцяй імперыі».

У 1939 годзе Усходняя Прусія і Памеранія, Мекленбург, Сілезія і Брандэнбург давалі 40 процантаў усіх пасеваў збожжавых, амаль столькі-ж буракоў і 43 процанты бульбы. У гэтых раёнах знаходзілася 30 процантаў пагалоўя буйнай рагатай жывёлы і свіней. У Сілезіі да вайны здабывалася 75 мільёнаў тон вугалю. У апошні час, паводле сцвярджання замежнага друку, здабыча набліжалася тут да 100 мільёнаў тон, уключаючы раёны Польшчы і Чэхаславакіі, якія знаходзіліся ў акупацыі. Тут-жа выплаўлялася значная колькасць каляровых металаў—свінца, пынку і іншых. Значэнне Сілезіі асабліва ўзрасло пасля эвакуацыі сюды раду прадпрыемстваў з захада. Цяпер Усходняя Прусія і Сілезія, Усходняя Памеранія і частка Брандэнбурга, як вядома, выпалі з нямецкага баланса.

Важнейшай ваенна-эканамічнай базай немпаў з'яўляўся Рэйнска-Вестфальскі раён. У 1937 годзе ў Руры, Саары і Аахене здабывалася звыш 150 мільёнаў тон вугалю—80 процантаў усёй германскай здабычы. Германія выплаўляла да вайны звыш 25 мільёнаў тон сталі ў год. З гэтай колькасці прыкладна 60 процантаў прыпадала на Заходнюю Германію. Тут сканцэнтраваны буйнейшыя прамысловыя гарады —Эсен, Дзюсельдорф, Дортмунд, Дуйсбург і Вупертаць. Тут размешчаны сусветна вядомыя заводы Крупа. Насельніцтва Рэйнска-Вестфальскага раёна складала да вайны звыш 13 мільёнаў чалавек.

Цяпер гэты раён ператварыўся ў зону баёў і значная частка яго ўжо знаходзіцца ў руках саюзнікаў. Трэба пры гэтым мець на ўвазе, што Рур прадстаўляе сабой выдатную мішэнь для ўдараў з паветра. Аб сіле гэтых усё ўзрастаючых удараў можна меркаваць хоць-бы па таму, што з 19 па 24 сакавіка авіяцыя саюзнікаў скінула на Рур 50 тысяч тон бомбавага груза.

Гітлераўцы, у выніку ўдараў Чырвонай Арміі, страцілі румынскую і венгерскую нафту, а таксама штучнае гаручае, якое выраблялася ў Сілезіі. Страта толькі румынскай нафты азначае для немцаў скарачэнне спажывання вадкага паліва прыкладна на адну трэць.

Бясспрэчна, што гітлераўская Германія, аграбіўшы амаль усю Еўропу, стварыла некаторыя запасы ваенна-стратэгічнай і ўсякай іншай сыравіны, а таксама прадуктаў. Але гэтага награбленага дабра немцам хопіць не надоўга, а магчыма нават, што яно ўжо канчаецца. Ваенная катастрофа азначае, такім чынам, катастрофу і ў галіне эканомікі, яна дэзарганізуе ўсё жыццё краіны, дэмаралізуе армію і народ. Фашысцкія прапагандысты да апошняй хвіліны могуць і будуць крычаць аб тым, што становішча Германіі яшчэ не безнадзейна, але ніхто не паверыць гэтай прапагандзе, бо факты знаходзяцца ў рэзкай супярэчнасці з усім тым, што прабуюць спвярджаць гебельсаўскія малойчыкі.

Яркім прыкладам такой «прапаганды» з'яўляецца выступленне гітлераўскага аглядальніка Отто Крыгка. «Большэвікі,—заявіў Крыгк па радыё 27 сакавіка,—па ўсіх участках усходняга фронта заўсёды прыходзяць да аднаго і таго-ж вынніку—ніякага тактычнага поспеху, які дазволіў-бы ім узяць у свае рукі ініцыятыву буйных прасоўванняў». Немпаў б'юць, як гаворыцца, і ў хвост і ў грыву, яны штодзённа трацяць адну пазіцыю за другой, а гітлеравец, які страціў усякае пачуццё рэальнасці, крычыць аб тым, што ўсё абстаіць добра, што большэвікі да гэтага часу не могуць узяць ініцыятыву ў свае рукі.

Падаплёка падобнай прапаганды ясная. Яна разлічана на тое, каб прымусіць нямецкі народ супраціўляцца да таго часу, пакуль не будуць вычарпаны ўсе магчымасці, супраціўляцца для таго, каб адцягнуць немінучую развязку. Вядома, што гітлераўцы ўзмоцнена рыхтуюць плацдармы для новай агрэсіі. Яны не толькі імкнуцца стварыць моцную фінансавую і прамысловую базу ў «нейтральных» краінах, але ўсімі спосабамі і сродкамі прабуюць выратаваць свае асноўныя кадры для ажыццяўлення гэтай агрэсіі. Вядома таксама, што ў сваім імкненні запягнуць вайну гітлераўцы зыходзяць з меркавання магчымасці некаторых рознагалоссяў у радах саюзнікаў. Для гэтага пускаюцца ў ход пробныя шары аб «міры», аб «пагрозе большэвізма», падымаецца шум з повада дэпансіравання совецкім урадам устаўшага совецка-турэцкага дагавора.

Перапалоханыя гітлераўцы стараюцца на-ходу змяніць акрываўленую фашысцкую вопратку на рубашку нявіннага дзіцяці. Яны пачынаюць салодкім голасам спяваць песні аб тым, што ўсе немцы, па сутнасці кажучы, вельмі добрыя людзі. Немцы прабавалі, заявіў гэтымі днямі гітлераўскі аглядальнік Шарпінг «Усімі сродкамі павысіць у акупіраваных абласцях узровень народнага здароўя. Шырокія колы рускага народа добра ведаюць германскую армію... Куды-б ні прыйшоў наш салдат, ён заўсёды быў занят тым, каб аблегчыць насельніцтву цяжар вайны». Гнеў і абурэнне выклікае гэтая заява фашысцкага нягодніка. Рускі народ, як і народы, якія знаходзіліся пад пятой у немцаў і цяпер вызваленыя Чырвонай Арміяй, сапраўды добра ведае германскую армію—армію забойцаў і гвалтаўнікоў, бандытаў і катаў; велае і не забудзе, не даруе гітлераўцам іх жудасных злодзеянняў.

Гітлераўцы імкнуцца любой цаной выратавацца ад разгрому. Але ніякія намаганні нацыстаў і іх яўных і тайных саўдзельнікаў не могуць прадухіліць разгрому гітлераўскай Германіі.

І. ГЛОТАЎ.

Гісторыя рагачоўскіх партызан

РАГАЧОЎ. (БЕЛТА). У горадзе створана кніга гісторыі партызанскага руху ў Рагачоўскім раёне. Ужо напісаны раздзелы: «Рагачоўскі раён перад Айчыннай вайной», «Першыя дні баявога партызанскага жыцця», «Быт рагачоўскіх народных мсціўцаў».

У кнізе будзе паказана шмат яркіх фактаў і лічбаў. Рагачоўскія партызаны знішчылі звыш 16 тысяч гітлераўцаў, спусцілі пад адкос 136 варожых эшалонаў, падбілі сорак восем нямецкіх танкаў і 550 аўтамашын. За доблесць і мужнасць, праяўленыя ў партызанскай барацьбе супроць нямецкіх захопнікаў, 50 рагачоўскіх народных мсціўцаў узнагароджаны ўрадам ордэнамі і медалямі, а лепшаму з іх—Філіпу Кавалёву—прысвоена званне Героя Совецкага Саюза.

АДНАЎЛЕННЕ ДОМІКА ПЕТРА ПЕРШАГА

ПОЛАЦК. У 1708 годзе, перад Палтаўскай бітвай з шведамі, Пётр I на працягу некалькіх тыдняў жыў у горадзе. У домику, дзе ён астанаўліваўся, быў створан музей. Гітлераўскія бандыты разбурылі яго, а экспанаты разграбілі.

Зараз домік Петра першага часткова ўжо адноўлен. Тут нанова будзе створан музей.

КАНЦЭРТЫ ДЗЯРЖАЎНАГА ЛІТОЎСКАГА ДЖАЗА

ГРОДНА. Сюды прыбыў Дзяржаўны літоўскі джаз-аркестр пад мастацкім кіраўніцтвам Якубаса Шабсаюза. Джаз выконвае літоўскія нацыянальныя песні. Канцэрты праходзяць з вялікім поспехам.

У бліжэйшыя дні джаз выязджае на гастролі ў іншыя гарады рэспублікі.

ШАХМАТНЫЯ СЕАНСЫ ГРОСМЕЙСТРА ФЛОРА

Гросмейстар Флор, які прыбыў у Мінск, 27 сакавіка даў першы сеанс адначасовай ігры ў шахматы на 32 дошках. Ігра працягвалася звыш двух гадзін і закончылася поўнай перамогай гросмейстра, не меўшага ніводнага паражэння.

(БЕЛТА).

УСТУПІЎ У СТРОЙ ДРЫСЕНСКІ ІЛЬНОЗАВОД

ДРЫСА. (БЕЛТА). Закончылася аднаўленне буйнейшага ў вобласці Дрысенскага ільнозавода, разбуранага нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Сваімі сіламі рабочыя адрамантавалі паравы рухавік, наладзілі водазабяспечанне, аднавілі насосную станцыю.

Зараз завод уступіў у эксплаатацыю.

Па Совецкаму Саюзу



Трактарыст Самат Доўран на раннім веснавым ворыве ў калгасе «Іскра», Кагановіцкага раёна, Туркменскай ССР. Ён выконвае па паўтары нормы ў дзень. (Здымак злева).

Перадавая ў Стаўропальскім краі Нова-Расшавацкая МТС, датэрмінова выканаўшы гадавы план рамонту трактараў, дапамагае суседнім МТС завяршыць падрыхтоўку да веснавых палявых работ.

На здымку: лепшая маладзёжная рамонтная брыгада трактарыстаў (злева направа): Е. Казлова, І. Шматаў, і З. Зайцаў за зборкай матора. Яны выконваюць штодзённа па 3—3,5 нормы. (Здымак справа).

МАГУТНЫЯ КРАНЫ ДЛЯ МЕТАЛУРГІЧНЫХ ЗАВОДАЎ

Сібірскі машынабудаўнічы завод асвоіў выраб магутных кранаў для прадпрыемстваў чорнай металургіі. Пры іх дапамозе робіцца разліўка метала з велізарных 125-тонных каўшоў.

У сучасны момант будуецца яшчэ больш магутны кран—грузападъёмнасцю ў 175 тон.

Новыя краны змантураваны са зварных канструкцый. Гэта ўдвая паскорыла прапэс іх вырабу а скарацила больш чым на 20 процантаў расходы металу.

(ТАСС).

КАНФЕРЭНЦЫЯ ПА ПЫТАННЯХ ВАЕННАЙ ТЭРАПІІ

У Кіеве адбылася канферэнцыя па пытаннях ваеннай тэрапіі, скліканая Наркаматам аховы здароўя УССР і інстытутам біяхіміі Акадэміі навук УССР. У рабоце канферэнцыі прыняла ўдзел каля 300 навуковых работнікаў, урачоў, работнікаў эвакашпіталяў, клінік, больніц, навукова-даследчых устаноў. Удзельнікі канферэнцыі заслухалі больш 20 дакладаў па актуальных пытаннях ваенна-палявой тэрапіі.

(ТАСС).

ПЕРШЫ СОВЕЦКІ ТРОХКАЛЯРОВЫ ФІЛЬМ

У Камітэце па справах кінематаграфіі пры Саўнаркоме СССР адбыўся прагляд першага совецкага трохкаляровага фільма «Іван Нікулін — рускі матрос». Да гэтага часу здымкі кінокарцін па спосабу трохкаляроўкі праводзіліся толькі ў Амерыцы. Усё абсталяванне для здымкаў і апрацоўкі плёнак зроблена па совецкіх заводах.

(ТАСС).

ГАРОДНІНА Ў РАЁНЕ ПОЛЮСА ХОЛАДУ

У 285 кілометрах ад полюса холаду размешчан самы паўночны соўгас Дальбуда «Сусуман» (Хабараўскі край). Не гледзячы на жорсткія ўмовы, там вырашчваюць гуркі, памідоры, радыску, салату. Штодзень ранняй вясной гарнякі атрымліваюць з цяпліц дзесяткі тон зеляніны.

У гэтым годзе пасеў гародніны ў соўгасе праведзен раней звычайнага—у дні, калі марозы перавышалі 50 градусаў. Зараз пяцілічныя спелажы густа пакрыліся зеляніной.

(ТАСС).

КАНФЕРЭНЦЫЯ БІБЛІЯТЭЧНЫХ РАБОТНІКАЎ МАСКВЫ

Закончылася канферэнцыя бібліятэчных работнікаў Масквы, скліканая Упраўленнем культурна-асветных прадпрыемстваў Моссовета. Канферэнцыя, у якой удзельнічала звыш 800 чалавек, падвяла вынікі работы сталічных бібліятэк за 1944 год і абгаварыла пытанні далейшага паляпшання абслугоўвання чытачоў.

За годы Айчыннай вайны попыт на кнігу рэзка вырас. Велізарнай увагай карыстаюцца палітычная і прыродазнаўча-асветная літаратура, кнігі па гісторыі нашай Радзімы. Чытачы глыбока вывучаюць кнігу таварыша Сталіна «Аб вялікай Айчыннай вайне Совецкага Саюза». За год бібліятэкі Масквы абслужылі каля 700.000 чытачоў сталіцы, выдаўшы ім звыш 14 мільёнаў кніг.

(ТАСС).

ВІНАГРАДНІКІ Ў ПАВАЛОЖЖЫ

На маленькім кавалку зямлі вопытнік-мічурынец С. Н. Палянскі вырасціў раннія гатункі вінаграду, які плоданосіць ва ўмовах Паволожжа. У мінулым годзе з 235 кустоў ён абраў больш 1.000 кілограмаў вінаграду.

Вопытны ўчастак Палянскага стаў свайго роду базай вінаградарства, якое развіваецца ў Куйбышэўскай вобласці. У гэтым годзе вінаградарства прымае больш шырокі размах.

(ТАСС).

АЗЕЛЯНЕННЕ СТАЛІЦЫ УЗБЕКІСТАНА

У Ташкенце — вясна. Насельніцтва сталіцы Узбекістана пад кіраўніцтвам вопытных садоўнікаў рыхтуе глебу для новых насаджэнняў. Вясной і восенню гэтага года ў горадзе будзе высаджана 100.000 фруктовых, 60.000 дэкаратыўных дрэў і 20.000 кустоў.

(ТАСС).

ШКОЛЫ ЮНГ У ЗАПАЛЯР'І

У Мурманску, Нар'ян-Мар і Мезені адкрыты школы юнг. Пачалі вучобу каля 400 падросткаў, у большасці—дзеці рыбакоў, інвалідаў Айчыннай вайны і франтавікоў. Усе выхавальнікі прыняты на поўнае дзяржаўнае забяспечанне.

(ТАСС).

ПА ПЫТАННЮ АБ УДЗЕЛЕ ПОЛЬШЧЫ НА КАНФЕРЭНЦЫІ Ў САН-ФРАНЦЫСКА

У сувязі з Канферэнцыяй па ўстанаўленню міжнароднай арганізацыі для падтрымання міру і бяспекі, якая адкрываецца 25 красавіка гэтага года ў г. Сан-Францыска (Злучаныя Штаты Амерыкі), Часовы Польскі Урад, як паведамлялася ўжо аб гэтым у друку, 22 сакавіка гэтага года звярнуўся да Урадаў Совецкага Саюза, Злучаных Штатаў Амерыкі, Вялікабрытаніі і Кітая з заявай, у якой ён указвае, што правядзенне Канферэнцыі ў Сан-Францыска без удзелу Польшчы было-б несправядлівай і нічым неапраўданай крыўдай для польскага народа. У гэтай заяве Часовы Польскі Урад выказваў таксама надзею, што прадстаўнікі польскага народа, у асобе Часовага Польскага Урада, будуць удзельнічаць у Канферэнцыі і што дэмакратычная Польшча зойме дастойнае месца ў сям'і Аб'еднаных Нацый.

Паводле атрыманых з аўтарытэтных крыніц вестак, Совецкі Урад яшчэ да ўказанай заявы Часовага Польскага Урада паведаміў Урадам Злучаных Штатаў Амерыкі і Вялікабрытаніі, што калі ў бліжэйшым будучым не будзе ажыццёўлена і закончана рэарганізацыя Часовага Польскага Урада, на Канферэнцыю ў Сан-Францыска трэба запрасіць прадстаўнікоў Часовага Польскага Урада ў Варшаве, як ажыццяўляючага ўладу на ўсёй тэрыторыі Польшчы і карыстаючагася падтрыманнем польскага народа. У гэтай заяве Совецкі Урад указаў, што адсутнасць прадстаўнікоў Польшчы на шырокай міжнароднай Канферэнцыі ў Сан-Францыска было-б не магчыма растлумачыць такімі матывамі, як адсутнасць дыпламатычных адносін паміж Урадамі Вялікабрытаніі і Злучаных Штатаў, з аднаго боку, і Часовым Польскім Урадам, з другога, бо Совецкі Урад таксама не мае дыпламатычных адносін з такімі краінамі, як Індыя, або Гаіці, Ліберыя, Парагвай, але ён пайшоў насустрач Вялікабрытаніі і Злучаным Штатам і згадзіўся на іх удзел на Канферэнцыі ў Сан-Францыска. Совецкі Урад прапанаваў абмеркаваць данае пытанне паміж саюзнымі Урадамі і прыняць адпаведнае рашэнне.

У сучасны момант Совецкі Урад паведаміў Урад ЗША, што ён чакае хуткага адказу на зробленую ім прапанову аб запрашэнні Польшчы на Канферэнцыю ў Сан-Францыска. Совецкі Урад паведаміў таксама Урадам Вялікабрытаніі і Кітая, што ён поўнасцю падтрымлівае заяву Часовага Польскага Урада і мяркуе, што Польшчы будзе прадастаўлена магчымасць удзелу на Канферэнцыі ў Сан-Францыска.

(ТАСС).

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў ЗАХОДНЯЙ ЕЎРОПЕ

ЛОНДАН, 31 сакавіка. (ТАСС). У паведамленні штаба вярхоўнага камандавання экспедыцыйных сіл саюзнікаў гаворыцца, што на поўначы ад Рура войскі саюзнікаў працягваюць хутка прасоўвацца на ўсіх участках фронта. Саюзнікі значна прасунуліся на захад ад Бохольта, Боркена і Дзюльмена. Часці саюзнікаў па ўсходзе ад Рура дасягнулі Падэрборна. На паўднёвым захадзе ад Каселя саюзнікі прасунуліся на 30 міль і знаходзяцца ля Альтвільдунгена і Фрытцлара.

Другія часці саюзнікаў падышлі да Боркена на чыгунцы Касель—Франкфурт. Уперадзе наступаўшых часцей прасоўваліся танкі, за імі ішла пяхота.

Бронетанкавыя часці, якія наступалі на поўначы і паўночным усходзе ад Бад-Наугейма, прасунуліся на 42 мілі да раёна Трэйза і Афельда, якія размешчаны ў 30 мілях на паўночным усходзе ад Гісена. Пяхотныя часці, якія наступаюць па ўсходзе і паўднёвым усходзе ад Ханау, адбілі дзве германскія контратакі.

Праціўнік аказвае моцнае супраціўленне ў раёне маста ля Вісбадэна. На поўдні ад Ашафенбурга саюзнікі ўтрымліваюць у сваіх руках прадмостнае ўмацаванне на рацэ Майн, даўжынёй у 12 міль і шырынёй у 3 мілі. У гэтым раёне немцы аказваюць упорнае супраціўленне на загадзе падрыхтаваных пазіцыях.

Пасля правалу перагавораў аб капітуляцыі, занят будынак старажытнага Гейдэльбергскага ўніверсітэта. За 29 сакавіка саюзнікі захапілі 18.542 палонных.

ДЗЕЯННІ АВІЯЦЫІ САЮЗНІКАЎ

ЛОНДАН, 31 сакавіка. (ТАСС). Як перадае карэспандэнт агенцтва Рэйтэр, які знаходзіцца пры штабе амерыканскіх стратэгічных ваенна-паветраных сіл у Францыі, звыш 1.300 амерыканскіх цяжкіх бамбардыроўшчыкаў у суправаджэнні прыкладна 850 знішчальнікаў зрабілі сёння налёт на завод сінтэтычнага гаручага ў Цэйцы, чыгуначныя дэпо ў Гале, а таксама на прамысловыя і чыгуначныя аб'екты ў Брауншвейгу.

ЛОНДАН, 31 сакавіка. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, у ноч на 31 сакавіка англійскія бамбардыроўшчыкі «Маскіта» зрабілі налёт на Берлін і Эрфурт, а таксама на аэрадромы і другія ваенныя аб'екты праціўніка.

ЛОНДАН, 31 сакавіка. (ТАСС). Як паведамляе карэспандэнт агенцтва Рэйтэр пры міжземнаморскім штабе саюзнікаў, цяжкія бамбардыроўшчыкі з састава міжземнаморскай авіяцыі саюзнікаў зрабілі днём 30 сакавіка налёт на чыгуначныя вузлы ў Вене і Грацы.

ПРЫЗНАННЕ УРАДАМ ЮГАСЛАВІІ ЧАСОВАГА УРАДА ПОЛЬСКАЙ РЭСПУБЛІКІ

БЕЛГРАД, 31 сакавіка. (ТАСС). 30 сакавіка вечарам у Белградзе было апублікавана наступнае афіцыяльнае камюніке:

«Сёння, 30 сакавіка гэтага года, адбылося паседжанне совета міністраў пад старшынствам маршала Тіто. На паседжанні вынесена рашэнне аб прызнанні Часовага Польскага Урада, які знаходзіцца ў Польшчы, і ўстанаўленні дыпламатычных адносін.

У рад саюзных краін назначаны дыпламатычныя прадстаўнікі.

Назначана дэлегацыя, якая будзе прадстаўляць Югаславію на прадстаячай у будучым месяцы ў горадзе Сан-Францыска канферэнцыі па забяспечанню міру.

Апрача таго, вынесен рад рашэнняў па пытаннях эканомікі, фінансаў і правасуддзя».

ВАЙНА НА ЦІХІМ АКІЯНЕ

ЛОНДАН, 31 сакавіка. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, штаб аб'еднанага камандавання ўзброенымі сіламі саюзнікаў у паўднёва-заходняй частцы Ціхага акіяна паведамляе, што амерыканскія войскі высадзіліся на заходнім узбярэжжы вострава Негрос (Філіпіны) і прасунуліся на 14 міль, заняўшы аэрадром Баколод. На востраве Лусон амерыканцы прадаўжалі прасоўвацца ўперад.

Амерыканскія самалёты падверглі бамбардыроўцы японскія докі і аэрадромы на востраве Фармоза.

Адказны рэдактар
В. САМУЦІН.

Сёння ў тэатрах і кіно:

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР імені Янкі КУПАЛЫ
«ПОЗНЯЕ КАХАННЕ»
Пачатак у 19 гадзін.

Кінотэатр «Першы»
«РОДНЫЯ ПАЛІ»
Пачатак сеансаў у 14, 16, 18, 20 і 22 гадз.

Кінотэатр «Беларусь»
«ДЗЯЎЧЫНА СПЯШАЕЦЦА НА СПАТКАННЕ»
Пачатак сеансаў у 14, 16, 18, 20 і 22 гадз.

Кінотэатр «Радзіма»
«ПАДКІДЫШ»
Пачатак сеансаў у 20 і 22 гадзіны.

Дзіцячы кінотэатр
«ПАДКІДЫШ»
Пачатак сеансаў у 10, 12, 14, 16 і 18 гадз.

БЕЛАРУСКАЯ
дзяржаўная ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга філармонія
У памяшканні Акруговага Дома Чырвонай Арміі
2, 3 і 4 КРАСАВІКА
КАНЦЭРТЫ
ЭСТРАДНА-МЕЛАДЫЧНАГА АНСАМБЛЯ ПАД МАСТАЦКІМ КІРАЎНІЦТВАМ Б. В. ГРАДСКАГА (Ленінград).
ПРЫ УДЗЕЛЕ:
ЛЕАНІД РАБІНСКІ (юмар, сатыра);
НАДЗЕЖДА БАХ (арыі з оперэт і жанравыя песні);
ФАІНА КОКОІНА (балет, класічныя, характэрныя танцы);
КЛЕАПАТРА ЗІМІНА (старынныя рамансы і табарныя песні);
ПАВЕЛ ГУЦІН (рытмічныя танцы).
Пачатак у 20 гадзін. Білеты ў касе А.Д.Ч.А. з 14 гадзін.

Упраўленне дзяржаўнага страхавання БССР
ПАВЕДАМЛЯЕ ПРАЎЛЕННЯМ КАЛГАСАЎ,
ШТО ПА СТРАХАВАННЮ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ КУЛЬТУР УСТАНОЎЛЕНА АДКАЗНАСЦЬ ДЗЯРЖСТРАХА ЗА СТРАТЫ АД ГРАДАБІЦЦЯ, ЛІЎНЯЎ, БУР, АГНЮ НА КОРАНІ, ВЫМАЧАК, ВЫМЯРЗАННЯ, ВЫПРАВАННЯ, ЗАМАРАЗКАЎ, ПАВОДКІ,
а па страхаванню МАХОРКІ, КОК-САГЫЗА, ХМЕЛЮ І ЛЯКАРСТВЕННЫХ ТРАЎ, апрача таго, і АД ЗАСУХІ.
АБ ГІБЕЛІ АБО ПАШКОДЖАННЯХ ПАСЕВАЎ АД УКАЗАНЫХ СТЫХІЙНЫХ БЕДСТВАЎ ПРАЎЛЕННІ КАЛГАСАЎ АБАВЯЗАНЫ ЗАЯВІЦЬ РАЕННАЙ ІНСПЕКЦЫІ ДЗЯРЖСТРАХА НЕ ПАЗНЕЙ 5 СУТАК З ДНЯ, КАЛІ УСТАНОЎЛЕНА ГІБЕЛЬ АБО ПАШКОДЖАННЕ ПАСЕВАЎ.
Упраўленне дзяржстраха БССР.

Кінотэатр „Першы“
з 2-га красавіка
НОВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ
„НАШЭСЦЕ“
(Па п'есе Л. Леонава).
Сцэнарый Б. Чыркова, рэжысёр А. Ром, сурэжысёр О. Жакаў, аператар С. Іваноў, мастак І. Мільчын, кампазітар Ю. Біркоў.
У ГАЛОЎНЫХ РОЛЯХ: заслужаны артыст РСФСР О. Жакаў, лаўрэат Сталінскай прэміі народны артыст СССР В. Ванін,
артысты: О. Жызнёва, Л. Шабаліна, В. Грэмін, Н. Валерскі, Г. Шпігель і другія.
Вытворчасць Алма-Ацінскай кіностудыі 1944 года.

Беларуская рэспубліканская кантора „Галоўкінопракат“
У БЛІЖЭЙШЫЯ ДНІ
ВЫПУСКАЕ НА ЭКРАНЫ КІНОТЭАТРАЎ РЭСПУБЛІКІ
НОВЫ АМЕРЫКАНСКІ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ
„Эдысон“
Сцэнарысты: Т. ДЖЭНІНГС, Б. ФУТ. Рэжысёр К. БРАУН.
У ГАЛОЎНЫХ РОЛЯХ: С. ТРЭСІ (То мс Эдысон),
Р. ДЖОНСОН (Мэры, яго жонка),
Д. ОВЕРМЭН (тэлеграфіст Кэвот),
Ч. КОБЭРН (генерал Пауэл),
Д. РАЙНОЛЬДС (Дмімі Прайс).
Аператар: Г. РОСОН. Музыкальнае афармленне: Г. СТОТГАРТ.
ВЫТВОРЧАСЦЬ МЕТРО-ГОЛДВІН-МАЙЕР.

Літаратурны музей Янкі Купалы,
ЯКІ ЗБІРАЕ І ВЫВУЧАЕ ЛІТАРАТУРНУЮ СПАДЧЫНУ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА ПАЭТА,
ПРОСІЦЬ ГРАМАДЗЯН,
ШТО МАЮЦЬ РУКАПІСЫ, АЎТОГРАФЫ, ФОТО і ўсё іншае, ЗВЯЗАНАЕ З ЖЫЦЦЕМ І ТВОРЧАСЦЮ ЯНКІ КУПАЛЫ, ПЕРАДАЦЬ ГЭТА У ФОНД МУЗЕЯ АБО ПРЫСЛАЦЬ ДЛЯ ПЕРАФАТАГРАФАВАННЯ АБО ЗНЯЦЦЯ КОПІЙ, прычым гарантыруецца зварот прысланых матэрыялаў.
АДРАС МУЗЕЯ: БССР, гор. Мінск, плошча Свабоды, Музей гісторыі вялікай Айчыннай вайны, для літаратурнага музея Янкі Купалы.

АТ28179 АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: г. Мінск, вул. Пушкіна, 55, 3-ці паверх. Тэлефоны: Адказнага рэдактара—149, Адказнага сакратара—150